ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 28 | ПЯТНІЦА, 3 ЛЮТАГА 1933 г. | № 28

Аб ходзе ссыпкі насенных фондаў.

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б.

1. Ня гледзячы на тое, што тэрмін сканчэньня ссыпкі насенных фондаў (15 студзеня 1933 г.) прайшоў, плян ссыпкі па становішчы на 26 студзеня выканан: па збожжавых культурах—на 86,1 проц., ільну—на 72,9 проц., канаплях—80,4 проц. і бульбе—91 проц.

ЦК КП(б)Б лічыць, што кіраўніцтва Сіроцінскага, Гарадоцкага, Шклоўскага, Прапойскага, Лоеўскага, Бешанковіцкага, Дрысенскага і Расонскага, як найбольш адстаючых па ссыпцы насеньня раёнаў, паказала няўменьне арганізаваць справу стварэньня насенных і страхавых фондаў. Райкомы і райвыканкомы гэтых раёнаў да гэтага часу не змаглі зламаць кулацкі сабатаж у гэтай галіне. ЦК лічыць асабліва нецярпімым адставаньне асноўных ільнаводчых раёнаў (Дрыса, Лепель, Асьвея, Расоны, Сіроціна, Гарадок, Крупкі, Шклоў, Сянно) у ссыпцы насеньня ільну і патрабуе неадкладнага стварэньня пералому ў гэтай справе.

2. У сувязі з вялікім адставаньнем Сіроцінскага, Гарадоцкага, Шклоўскага, Прапойскага, Лоеўскага, Бешанковіцкага, Дрысенскага і Расонскага раёнаў па ссыпцы насенных фондаў забараніць у гэтых раёнах гандаль збожжам, папярэдзіўшы РК КП(б)Б гэтых раёнаў, што ЦК будзе вымушан ужыць у адносінах кіраўніцтва гэтых раёнаў самыя рашучыя меры ўзьдзеяньня, калі ня будзе дасягнут у бліжэйшыя дні пералом у ссыпцы насенфондаў. Зусім забараніць гандаль збожжам у іншых раёнах БССР тым калгасам, калгасьнікам і аднаасобнікам, якія ня ссыпалі насенных фондаў.

Устанавіць канчатковы тэрмін ссыпкі насенных фондаў 5 лютага.

3. У тых калгасах і раёнах, дзе ня скончана ссыпка насенных фондаў, спыніць разьмеркаваньне даходаў у калгасах, там, дзе гэта разьмеркаваньне праведзена і насенфонды яшчэ не створаны, што азначае фактычнае раскраданьне насеньня,—аднавіць насенныя і страхавыя фонды за кошт насеньня, атрыманага калгасьнікамі на рукі.

4. У адносінах аднаасобных гаспадарак абавязаць райкомы і РВК браць пісьмовыя абавязацельствы аб поўным забесьпячэньні гаспадаркамі насеньнем устаноўленага цьвёрдага пасеўнага пляну. Устанавіць адказнасьць за захаваньне насеньня члена сельсавету даннай вёскі і члена камісіі садзейнасьці, а таксама:

а) устанавіць сыстэму ўпаўнаважаных, якія адказваюць за хаваньне насеньня на кожныя 10 двароў аднаасобнікаў. Упаўнаважаныя павінны выбірацца на сходах дзесяцідворкі і зацьвярджацца сельсаветамі;

б) шырока практыкаваць пад кіраўніцтвам члена сельсавету праверку групамі аднаасобнікаў за хаваньне насеньня адзін у аднаго;

в) правесьці праверку і ў неабходных выпадках дэзынфэкцыю сьвірнаў, дзе хаваецца насеньне.

5. Абавязак РК і РВК забясьпечыць ссыпку насенных і страхавых фондаў па культурах у строгай адпаведнасьці з плянам сяўбы для кожнага калгасу.

У тых выпадках, калі РВК на месцы ў калгасах будзе ўстаноўлена адсутнасьць насеньня аўса, дазволіць ссыпку замест аўса жытам і пшаніцай. Даручыць Наркамзему даць на месцы дырэктыву ў адпаведнасьці з гэтай пастановай.

Папярэдзіць усе РК і РВК, што выкананьне пляну ссыпкі насенных і страхавых фондаў будзе лічыцца скончаным толькі тады, калі усё насеньне будзе ачышчана, адсартавана і гатова да сяўбы.

6. За няпрысылку рэгулярных зводак па ссыпцы насенных фондаў загадчыкам райЗА Мсьціслаўскага—тав Старасьціну, Лагойскага—тав. Сарвіра, Чырвонаслабодзкага—тав. Кавальчуку, Клічаўскага—тав Бабарыка, Аршанскага—тав. Жылінка, Лельчыцкага—тав Кадовічу, Мазырскага—тав. Радзіяновічу, Парыцкага—тав Бушалю, Крычаўскага—тав. Рыбакову (ня прыслалі зводак за 5 – 7 дзён) абвясьціць суровую вымову.

Папярэдзіць гэтых загадчыкаў райЗА, што ў выпадку няпрысылкі зводкі аб ссыпцы насенных фондаў да іх будуць прыняты больш суровыя меры ўзьдзеяньня.

Прапанаваць Наркамзему і райкомам устанавіць самы строгі і дакладны ўлік ссыпкі насенных фондаў і рэгулярную штодзённую справаздачнасьць.

АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

ЦК КП(б)Б і СНК адзначаюць, што партыйныя, камсамольскія, савецкія і зямельныя арганізацыі не разгарнулі баявой апэрацыйнай канкрэтнай барацьбы за бальшавіцкую арганізацыю і правядзеньне веснавой сяўбы. Як у цэнтры, так і на месцах мае месца апартуністычны самацёк (асабліва на месцах) і нявыданьне з боку большасьці раённых арганізацый (РК, РВК, райЗА і гэтак далей) як забясьпечыць канкрэтна справу ў кожным паасобным калгасе, саўгасе, вучастку МТС з ходам падрыхтоўкі і забесьпячэньнем пасеўкампаніі па асноўных элемэнтах (насеньне, цягавая сіла, машыны, угнаеньне, расстаноўка сіл і разьбіўка брыгад). Наркамзем і ўпаўнаркамсаўгасаў таксама дрэнна ведаюць становішча па гэтых-жа пытаньнях у кожным паасобным раёне, саўгасе, МСТ.

ЦК КП(б)Б і СНК падкрэсьліваюць, што ўжо зараз ёсьць у наяўнасьці праяўленьні адкрыта-кулацкага антысавецкага сабатажу і шкодніцтва, накіраванага на зрыў веснавой сяўбы, адмаўленьне ад плянаў сяўбы. Рад раённых партыйных, камсамольскіх, савецкіх і зямельных арганізацый ня робяць належных вывадаў і ўрокаў з загатоўчай кампаніі. Разгром кулацкіх, антысавецкіх, шкодніцкіх элемэнтаў і чыстка партыйных радоў ад варожых, прымазаўшыхся, перарадзіўшыхся элемэнтаў павінна з усёй рашучасьцю і яшчэ большай настойлівасьцю працягвацца і ўсялякія дэмабілізацыйныя настроі павінны разглядацца як просты сабатаж падрыхтоўкі да сяўбы.

Выходзячы з пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу ад 23 студзеня 1933 г. па пытаньні «аб мерапрыемствах па арганізацыі веснавой сяўбы на Паўночным Каўказе»,—ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

1. Зацьвердзіць канчатковы плян яравога пасеву на 1933 г. у разьмеры 2.680 тыс. га, з іх: для калгасаў—1.255 тыс. га, аднаасобнікаў—1.295 тыс. га і саўгасаў—160 тыс. га.

Па культурах: збожжавых—1.348 тысяч га, тэхнічных—298 тысяч га і бульбе—620 тысяч га.

Для забесьпячэньня насеньнем устаноўленай плошчы правесьці ссыпку насеньня і страхавых фондаў у калгасах: па збожжы—132 тыс. тоны, па тэхкультурах—20.350 тыс. тон і па бульбе—480 тыс. тон.

2. У адпаведнасьці з пастановамі студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) устанавіць наступнае ў сярэднім па рэспубліцы павышэньне ўраджайнасьці на 1933 год: збожжа—8 цэнтнераў з га, ільну—2,4 цэнтнераў, бульбы—100 цэнтн.

Даручыць Наркамзему ў адпаведнасьці з гэтай пастановай удасканаліць заданьні для раёнаў, а раёнам там, дзе заданьні ўжо дадзены, удасканаліць для сельсаветаў, калгасаў, саўгасаў, МТС.

3. Асноўная ўвага ў падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы павінна быць зьвернута на поўную і добраякасную падрыхтоўку насеньня, недапушчэньне малейшага спазьненьня з сяўбой і поўнае выкананьне пляну сяўбы, скарачэньне тэрмінаў сяўбы і рашучае палепшаньне якасьці апрацоўкі глебы, на правядзеньне раньняга ворыва, своечасовую падрыхтоўку цягавай сілы, трактароў і машын і іх добраякасны рамонт, своечасовы і поўны вываз мінэральных угнаеньняў.

Для гэтага неабходна скончыць усю падрыхтоўку да веснавой сяўбы (ссыпка насеньня, рамонт машын, вываз угнаеньня, разьбіўка брыгад і прымацаваньне іх да вучасткаў, устанаўленьне палёў севазвароту і г. д.) у тэрміны, устаноўленыя пленумам ЦК КП(б)Б і паслядуючымі рашэньнямі ЦК.

4. Абавязаць Наркамзем не пазьней 2/II 1933 г. даслаць раёнам прыкладную схему севазвароту для паасобных вытворчых тыпаў калгасаў, а РВК—давесьці да калгасаў з такім разьлікам, каб на падставе іх, адначасова са складаньнем вытворчых заданьняў на 1933 г., калгасы ўстанавілі і прынялі ў адпаведнасьці з плянам сяўбы і спэцыялізацыі севазвароты, якія разам з вытворчымі плянамі павінны быць зацьверджаны райзямаддзеламі. Для практычнай дапамогі раёнам у справе ўстанаўленьня севазваротаў прапанаваць Наркамзему камандыраваць у раёны лепшых спэцыялістаў цэнтральных апаратаў і навукова-дасьледчых устаноў. У лютым месяцы правесьці ў раёнах інструкцыйныя нарады зямельных працаўнікоў і агра-спэцыялістаў па пытаньнях севазвароту.

5. Правесьці абмен звычайнага насеньня на гатунковае і таварна-гатунковае для збожжа і тэхкультур да 15-га лютага і бульбы да 1-га мая 1933 г.

6. У мэтах павышэньня ўраджайнасьці і эканоміі насеньня поўнасьцю скарыстаць радковыя сявалкі ва ўсіх саўгасах, калгасах і МТС. Даручыць Наркамзему і ўпаўнаркамсаўгасаў даць раёнам і саўгасам заданьні па радковай сяўбе, а РВК і дырэктарам МТС давесьці плянавыя заданьні радковай сяўбы да паасобных сельсаветаў і калгасаў з улікам поўнай нагрузкі на кожную сявалку.

Забараніць пасеў усіх культур у адзявор (без паўторнага ворыва) у часе веснавой сяўбы.

7. Лічыць абавязковым побач са строгім кантролем увядзеньне бракеражу паасобных палявых работ (ворыва, баранаваньне, дыскаваньне і г. д.) ва ўсіх саўгасах, калгасах, якія абслугоўваюцца МТС.

Даручыць Наркамзему і ўпаўнаркамсаўгасаў і кіраўнікам трактарацэнтраў распрацаваць і даць на месцы адпаведныя ўказаньні па гэтаму пытаньню.

8. Лічыць абавязковым поўную вывазку наяўнага гною пад яравы пасеў, з якога ня менш 60 проц. павінна быць вывезена ў зімовы час.

Даручыць Наркамзему і ўпаўнаркамсаўгасаў давесьці на працягу дэкады плян вывазу гною да раёнаў і саўгасаў, а РВК і МТС у гэты-ж тэрмін—да калгасаў і вёсак.

9. Устанавіць наступныя тэрміны сяўбы: збожжа і тэхкультур на працягу 12-ці дзён, а бульбы і караньплодаў—15-ці дзён. Даручыць Наркамзему і ўпаўнаркамсаўгасаў устанавіць тэрміны пачатку сяўбы па паасобных зонах і культурах, а таксама пашырыць вопыт звышраньняй сяўбы аўса і ільну.

Прапанаваць РВК і дырэктарам МТС і саўгасаў устанавіць каляндарныя тэрміны сяўбы па кожнаму калгасу і саўгасу.

10. Ускласьці асабістую адказнасьць за правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў па Наркамзему на т. Рачыцкага, па кіраўніцтву ўпаўнаркамсаўгасаў на т Сьмірнова І. М., па Ільнотрактарацэнтру—на тав. Качука, па Бульбатрактарацэнтру—на тав. Грабенчыка, па Збожжатрактарацэнтру—на тав. Дубоўскага. У раёнах гэта адказнасьць павінна быць ускладзена на загадчыкаў райЗА, у саўгасах і МТС—на дырэктароў і іх намесьнікаў па тэхнічнай частцы, а ў калгасах—на праўленьні калгасаў і рэвіз. камісіі.

11. Для рашучага папярэджаньня маючага да гэтага часу месца няпоўнага скарыстаньня трактароў і с.-г. машын і частай паломкі іх, ЦК і СНК абавязваюць Наркамзем, упаўнаркамсаўгасаў і кіраўнікоў Трактарацэнтру даць у двухдзённы тэрмін канкрэтныя дырэктывы, якія павінны забясьпечыць:

а) канчатковую ліквідацыю абязьлічкі ў карыстаньні машын;

б) устанаўленьне норм нагрузкі на трактар і асноўныя складаныя с.-г. машыны; арганізацыю папераджальнага рамонту машын і трактароў у час разгорнутых веснавых палявых работ;

в) падрыхтоўку і перападрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для работы на трактарах і складаных с.-г. машынах, неадкладна ачысьціўшы склад трактарыстаў і ўсіх працуючых на складаных с.-г. машынах, ад усіх антысавецкіх элемэнтаў, вядучы рашучую барацьбу з нядбайнымі і шкодніцкімі адносінамі да машын. Разам з тым намеціць і правесьці рад мерапрыемстваў, якія-б стымулявалі лепшыя адносіны да машын.

12. ЦК і СНК указваюць, што правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў у значнай меры будзе вырашаць калгасная брыгада і таму ўсямернае ўмацаваньне вытворча-калгасных брыгад, высоўваньне і выхаваньне яе актыву і ў першую чаргу самога брыгадзіра—зьяўляецца адной з важнейшых задач усіх партыйных і савецкіх арганізацый. У сувязі з гэтым неабходна:

а) Адначасова з давядзеньнем да калгасаў плянаў веснавой сяўбы і складаньнем вытворчых плянаў—выдзеліць, замацаваць за брыгадай на 1933 г. вытворча-зямельныя вучасткі, распрацаваць і давесьці ў кожным калгасе да кожнай брыгады плян веснавой сяўбы і тэрміны яе правядзеньня з абавязковым указаньнем усяго комплексу агратэхнічных мерапрыемстваў, якія павінны быць праведзены брыгадай на вытворчым вучастку, заданьні па ўраджайнасьці, нормы выпрацоўкі і нормы высеву. Вытворчыя заданьні павінны быць абгавораны абавязкова на брыгадна-вытворчых нарадах;

б) замацаваць за кожнай брыгадай с.-г. інвэнтар, рабочую жывёлу, насенны матар'ял і кармовыя фонды для рабочай жывёлы.

Для ўзмацненьня сапраўднай адказнасьці брыгадзіра ўсёй брыгады за спраўнасьць і захаваньне ў добрым стане рабочай жывёлы і с.-г. інвэнтару, устанавіць павышаную і паніжаную ацэнкі працадзён у залежнасьці ад стану замацаванай за брыгадай рабочай жывёлы і інвэнтару;

в) абвязаць РВК, сельсаветы, дырэктароў саўгасаў і праўленьне калгасаў арганізаваць узаемадапамогу ў справе падрыхтоўкі ў правядзеньні веснавой сяўбы, а таксама дапамогу аднаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам у правядзеньні агра-тэхнічных мерапрыемстваў і рамонту інвэнтару, а з боку сялян-аднаасобнікаў—рабочай і жывой цягавай сілы.

13. ЦК і СНК папярэджваюць партыйныя і савецкія арганізацыі, работнікаў зямельных органаў, МТС і саўгасаў, а таксама членаў праўленьняў і брыгадзіраў у калгасах, што іх першачарговым абавязкам зьяўляецца прыняцьцё самых рашучых мер да таго, каб зламаць усялякія праяўленьні кулацкага сабатажу і шкодніцтва ў часе збору насеньня ці сяўбы, прычым усялякія праяўленьні мяккіх адносін да ворагаў народу, якія сабатуюць сяўбу, будуць разглядацца як дапамога з іх боку кулаку і контррэвалюцыйнаму шкодніку.

ЦК і СНК абавязваюць мясцовыя органы ўлады разглядаць заўважваемых у пакражы насеньня са сьвірнаў і сявярак ці ў шкодніцкім зьмяншэньні норм высеву і шкодніцкай рабоце пры ворыве і сяўбе, у шкодніцкіх адносінах да машын, коняй і ўгнаеньняў, разьлічаных на псаваньне палёў і зрыў ураджаю,—як раскрадальнікаў калгаснай і дзяржаўнай маёмасьці і прыстасоўваць да іх дэкрэт ад 7/VII-32 г. аб ахове грамадзкай маёмасьці, не дапушчаючы паблажкі.

14. ЦК і СНК папярэджваюць партыйныя і савецкія арганізацыі аб недапушчальнасьці ігнараваньня аднаасобнікаў пры выкананьні пасеўнага пляну. ЦК і СНК напамінаюць, што не пазьней 15 лютага кожнаму аднаасобніку павінен быць уручан абавязкова цьвёрды плян сяўбы і ў адпаведнасьці з гэтым плян ссыпкі насенных фондаў. Прычым да гаспадарак, якія сабатуюць сяўбу, павінны ўжывацца рашучыя меры грамадзкага і судовага ўзьдзеяньня.

15. ЦК і СНК абавязваюць партыйныя, савецкія і зямельныя арганізацыі, а таксама органы друку разгарнуць вакол задач падрыхтоўкі веснавой сяўбы шырокую масавую, палітычную работу. Неабходна асабліва растлумачыць сярод мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў пастановы ЦК і СНК аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі і аб мерапрыемствах па арганізацыі веснавой сяўбы на Паўночным Каўказе.

16. Для пасьпяховага і своечасовага правядзеньня сяўбы па ўсіх сэктарох, стварыць камісію ЦК і СНК пад старшынствам т. Гікало у складзе т.т. Галадзеда, Шаранговіча, Лычова, Рачыцкага, Закоўскага і Жолудава. Камісіі прымаць усе неабходныя меры ад імя ЦК і СНК БССР. Пастановы камісіі лічыць безумоўна абавязковымі для ўсіх органаў, прадпрыемстваў і ўстаноў рэспублікі, не падлягаючымі абскарджаньню.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ФЗМК.

ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ АБАВЯЗАНЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ АКТЫЎНАЕ, МАСАВАЕ І ДЗЕЙСНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ПЕРАВЫБАРАЎ ПРАФОРГАНАЎ.

У аснову ўсёй работы па справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК пакласьці рашэньні пленуму ЦК і ЦКК і праграмную прамову тав. Сталіна.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія падыходзіць да канца. Мы за апошнія дні далі рад гар'ялаў, які яскрава паказваў, што на асобных прадпрыемствах („Чырвоны мэталіст", „Сьцяг індустрыялізацыі") далёка не зразумелі ўсёй важнасьці падрыхтоўчай работы да правядзеньня гэтай кампаніі, як магутнага вагара для палепшаньня ўсёй прафсаюзнай работы на прадпрыемствах, для ўзьняцьця тэмпаў у ажыцьцяўленьні нашых плянаў па ўсіх паказчыках.

Гістарычны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), праграмныя паказаньні т. Сталіна—высоўваюць зараз перад усёй нашай партыяй, перад прафсаюзам, як прыводным рамнём ад партыі да мас павышаныя адказныя задачы. У першым годзе другой пяцігодкі мы рашуча павінны падняць прадукцыйнасьць працы, значна палепшыць якасьць прадукцыі і зьнізіць сабекошт. Наша сельская гаспадарка, якая зьмяніла свой твар, на аснове калектывізацыі і зьнішчэньня на гэтай базе кулацтва, як клясы, патрабуе зараз, як ніколі, сапраўднай бальшавіцкай дапамогі з боку пралетарскага гораду. Аб гэтым яскрава гаварыў на аб'яднаным пленуме т. Сталін.

Арганізаваць масавую прапрацоўку рашэньняў аб'яднанага пленуму і пачаць работу па ажыцьцяўленьні рашэньняў пленуму ў жыцьцё—гэта адна з баявых задач у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК.

Вось чаму ў наказах новым складам нізавых прафзьвеньняў чырвонай ніцьцю павінны праходзіць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні рашэньняў гістарычнага пленуму і паказаньняў тав. Сталіна, па асваеньні новых прадпрыемстваў, новай тэхнікі, узьняцьця прадукцыйнасьці працы, зьніжэньні сабекошту, ліквідацыі браку, умацаваньні працоўнай дысцыпліны, па аказаньні пралетарскай дапамогі калгасам у іх арганізацыйна-гаспадарчым і палітычным умацаваньні.

Уся наша прафсаюзная арганізацыя павінна ўлічыць тыя грубыя палітычныя памылкі, якія былі дапушчаны на „Чырвоным мэталісьце" і „Сьцягу індустрыялізацыі" (складаньне палітычнага наказу, выбары без удзелу рабочых, явка на справаздачна-перавыбарчы сход) і арганізаваць масы на пасьпяховае правядзеньне і завяршэньне гэтай баявой кампаніі, рашуча ўмацніўшы партыйнае кіраўніцтва ходам справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Ня браць прыкладу ў гэтых адносінах з арганізацый „Сьцягу", дзе сакратар парткому Шыфрын, старшыня фабкому Жутчанка і рэдактар шматтыражкі Ліпнік ня толькі не забясьпечвалі партыйнае кіраўніцтва ходам кампаніі, як камуністы, як кіраўнікі арганізацый непасрэдна адказваючых за посьпех гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства, але нават не палічылі сваім абавязкам прысутнічаць на цэхавых сходах, прысьвечаных справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК.

Кожны парткалектыў, кожная парт'ячэйка павінны памятаць, што моцнае партыйнае кіраўніцтва рашае посьпех правядзеньня кампаніі. У практычнай рабоце па перавыбарах мы, ажыцьцяўляючы пастанову ЦК КП(б)Б, павінны «дабіцца таго, каб перавыбары гэтых органаў зьявіліся фактарам сапраўднай мабілізацыі шырокіх рабочых мас на практычнае ажыцьцяўленьне задач, якія пастаўлены ў дакладзе тав. Сталіна і пастановах студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб выніках першай пяцігодкі і канкрэтных задачах першага года другой пяцігодкі».

Пры актыўным удзеле рабочых брыгад.

На шчоткамбінаце шырока разгорнута работа па справаздачна-перавыбарчай кампаніі прафарганізацый. Ва ўсіх цэхах работаюць самаправерачныя брыгады. Закончана праверка работы прафоргаў. Абраны праформі з лепшых рабочых-ударнікаў.

Самаправерачныя брыгады выявілі, што праформі не работалі, не праводзілася ніякай інструкцыйнай работы з прафоргамі з боку цэхкамітэтаў і фабкому.

Закончылася праверка работы цэхкамітэтаў. Выяўлена, што асабліва дрэнна ўвесь час работаў цэхавы камітэт воласапрадзільнага цэху на чале з старшынёй Асташэнка. Цэхком фактычна стаяў у баку ад гаспадарча-палітычнага жыцьця цэху. Трэба адзначыць, што рабочыя некалькі разоў ставілі перад фабкомам пытаньне аб бяздзейнасьці гэтага цэхкому, але былы старшыня фабкому Куранкоў (зараз зьняты з работы і выключаны з партыі) заўсёды гаварыў, што цэхком волаcапрадзільнага цэху работае «добра».

У выніку бяздзейнасьці цэхкому многа рабочых, якія работаюць на камбінаце на працягу некалькі месяцаў, не ахоплены прафсаюзным членствам. Ніводзін сэктар цэхкому не работаў.

Лепш за ўсіх цэхкамітэтаў работаў цэхком наборна-аддзелачнага цэху на чале з т. Богры. Гэты цэх, дзякуючы разгорнутай масавай работе цэхкомам, займаў першынства ва ўнутрыфабрычным конкурсе на лепшую падрыхтоўку да другой пяцігодкі, свой гадавы плян, пры актыўнай дапамозе сваёй прафарганізацыі, цэх выканаў на 110,4 проц.

Зараз разгарнулася самаправерачная работа фабкому, вялікі ўдзел у якой прымае асоавіяхэмаўская брыгада. За час самаправеркі прынята ў саюз 36 рабочых, запазычанасьць па членскіх узносах пакрыта на суму 1179 руб.

Р. Гельмэс.

СЁНЬНЯ АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ.

Сёньня, 3-га лютага, а 6 гадз. увечары, у клюбе мэталістаў (Узьбярэжная ракі Дзьвіны) адбудзецца АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ, прысьвечаны вынікам паходу «За сацуклад у другую пяцігодку».

На абвестцы дню:

1) Выступленьне сакратара гаркому КП(б)Б тав. Міцькова.

2) Даклады рэдакцыі «Віцебскага пралетара», насьценгазэт «Сьцягавец», «За шпаркія тэмпы», шматтыражкі «Артылерыст».

3) Урачыстая перадача школе лётнікаў самалёту „Рабселькор ударнік Віцебшчыны".

Пасьля афіцыйнай часткі—мастацкая частка.

Уваход па білетах, якія можна атрымаць у рэдакцыі «Віцебскага пралетара» (пакой № 41) да 4-х гадз. дню.

Гарадзкі штаб паходу «За сацуклад».

Пастановай студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) у саўгасах і МТС і краявых рэспубліканскіх цэнтрах гэтых арганізацый створаны палітаддзелы. У задачы палітаддзелаў уваходзіць кіраўніцтва партыйна-палітычнай работай у саўгасах і калгасах, аб'яднаемых МТС.

Тав. Крыніцкі Аляксандр Іванавіч—прызначаны начальнікам палітычнага кіраўніцтва МТС пры Наркамземе СССР.

Тав. Сомс Карл Пятровіч—прызначаны начальн. палітычнага кіраўніцтва Наркамзему зерневых і жывёлагадоўчых саўгасаў СССР.

РЭЗАЛЮЦЫІ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ГАРКОМУ КП(б)Б

(23—25 студзеня 1933 г.).

ВЫНІКІ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ ЦК І ЦКК КП(б)Б ПА НАЦПАЛІТЫЦЫ І ДАЛЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ.

Рэзалюцыя студзеньскага пленуму гаркому КП(б)Б.

1. На падстаце ажыццяўленьня ленінскай нацпалітыкі і барацьбы са скажэньнямі і ўхіламі ад яе, у першую чаргу з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай на данным этапе, выконваючы дырэктывы X зьезду РКП(б), што «задача партыі састаіць у тым, каб дапамагчы працоўным масам невялікарасійскіх народаў дагнаць ушоўшую ўперад цэнтральную Расію», партыя, над. кіраўніцтвам свайго ЦК і свайго правадыра т. Сталіна, няўхільна праводзіць курс на індустрыялізацыю і наогул эканамічны і культурны ўздым былых каленіяльных ускраін самымі шпаркімі тэмпамі.

Вялічэзны рост сацыялістычнай прамысловасьці БССР, у тым ліку і Віцебску, і на падставе гэтага рост пралетарскіх кадраў з мясцовых нацыянальнасьцей, шырокі размах калектывізацыі, ліквідацыю на яе аснове кулацтва як клясы, рост добрабыту і культуры працоўных мас (суцэльная пісьменнасьць, усеагульнае абавязковае навучаньне, вышэйшая асьвета, літаратура, мастацтва), колькасны і якасны рост нацыянальных кадраў па ўсіх галінах гаспадаркі і культурнага будаўніцтва. На фоне эканамічнага руйнаваньня Заходняй Беларусі, прыгнечанай польскім фашызмам—зьяўляецца яскравым паказальнікам вялізарнейшых посьпехаў ленінскай нацыянальнай палітыкі.

2. Адзначаючы гэтыя вялічэзнейшыя посьпехі ленінскай нацпалітыкі, пленум гаркому КП(б)Б канстатуе яўны разрыў паміж гаспадарча - культурным ростам нашага раёну і становішчам партыйнай і масавай работы віцебскай партарганізацыі ў галіне нацыянальнай палітыкі.

Пленум падкрэсьлівае, што паказаньні ЦК і ЦКК КП(б)Б, дадзеныя па абсьледаваньню віцебскай партарганізацыі ў 1931 годзе, аб тым, што

«на палітычных уроках змаганьне КП(б)Б з вялікадзяржоўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на данным этапе, з контрраволюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, не выхоўвалася партарганізацыя і рабочая клясa; ...недапушчальна дрэнная становішча ў правядзеньні беларусізацыі, нерашучая барацьба з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму; беларусізацыя, як неадлучная частка ленінскай нацпалітыкі, не ўзьнята на прынцыповую палітычную вышыню; гэта зьяўляецца самым глыбокім прарывам у рабоце віцебскай партарганізацыі»,

захоўвае сваю сілу і ў сучасны момант.

Гэткае становішча стварылася ў выніку слабага кіраўніцтва практычным ажыццяўленьнем рашэньняў ЦК і ЦКК, апартуністычнай недаацэнкі іх і адсутнасьці сапраўднай барацьбы з вялікадзяржаўніцкімі і шавіністычнымі элемэнтамі, якія актыўна альбо замаскавана супраціўляюцца ажыццяўленьню нацыянальнай палітыкі партыі.

Пленум лічыць існуючае становішча надалей нецярпімым і заяўляе, што віцебская партарганізацыя, ачышчаючы свае рады ад вялікадзяржаўніцкіх, нацдэмаўскіх і іншых шавіністычных элемэнтаў, даючы бальшавіцкі адпор усякім ухілам ад генэральнай лініі партыі, можа і павінна на справе стаць на чале ажыццяўленьня ленінскай нацпалітыкі і забясьпечыць неадкладны пералом да практычнага выкананьня рашэньняў ЦК і ЦКК.

3. Далейшае абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне, якое зьяўляецца прамым адбіцьцём таго факта, што мы «вышлі ў канец апошніх рэшткі варожых нам клясаў з іх вытворчых пазыцый, разгромілі кулацтва і падрыхтавалі глебу для яго зьнішчажэньня» (Сталін), праяўляецца таксама і ў актывізацыі буржуазна-нацыяналістычных элемэнтаў. Именна на гэтай глебе зашавеліліся асколкі контррэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны, актывізуюцца вялікадзяржаўныя шавіністы і шавіністы іншых масьцей, меў месца рад контррэвалюцыйных выступленьняў буржуазна-кулацкіх і перараджэнцкіх элемэнтаў пад прыкрыцьцём фальшыва-нацыянальнага сьцягу, якія выкарыстоўваюць слабасьць партыйнага кіраўніцтва, гніласьць лібэралізм і страту клясавай пільнасьці партыйцаў на радзе вучасткаў нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Віцебшчыне (нацдэмаўская вылазка мастака Міяіна, антысавецкія пашляціна у самадзейных драмгуртках, адчыненае і замаскаванае супраціўленьне беларусізацыі, справы вялікадзяржаўных шавіністаў Шабанава, Чубахінай, Афрамовіч, Сідаркі, справа антысэмітаў і прымірэнцаў да іх на заводзе „Пралетары" і інш.).

Ад партарганізацыі і кожнага камуніста патрабуецца значнае пасіленьне барацьбы за чыстату ленінскай нацпалітыкі, узмацненьне барацьбы з тымі буржуазна-нацыяналістычнымі перараджэнцкімі элемэнтамі, якія прыкрываюць сваю контррэвалюцыйную дзейнасьць фальшыва-нацыянальным сьцягам, патрабуецца значнае павышэньне рэвалюцыйнай пільнасьці, ідэйна-палітычнага ўзроўню партыйцаў і камсамольцаў, асваеньне імі асноўных прынцыпаў ленінізму і ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Пленум абавязвае бюро гаркому і ўсе парткалектывы і ячэйкі забясьпечыць прыняцьцё самых рашучых мер да канкрэтных посьбітаў шавіністычнай практыкі і ідэалёгіі і да тых партыйцаў, якія прымірэнча, па-лібэральнаму адносяцца да контррэвалюцыйнай дзейнасьці і сабатажу мерапрыемстваў партыі па ажыццяўленьню яе нацыянальнай палітыкі шавіністамі розных масьцей.

Пленум прызнае нездавальняючай работу ў галіне правядзеньня нацпалітыкі партарганізацыямі і кіраўнікамі: чыгуначнага вузлу, ЦРК (Танхільсон, Гіцовіч), канторы сувязі (Хвесюк, Акімаў), «Сьцяга індустрыялізацыі» (Шыфрын, Каган), фабрыкі імя Цэткін (Жураў, Ханіна) і слабай работу культаддзела гарпрафсавету (Левіна). Пленум патрабуе ад пералічаных таварышоў стварэньня бязадкладнага пералому і доказу на справе, што яны здольны змагацца за нацыянальную палітыку партыі.

Пленум прапануе бюро ГК і ўсім парткалектывам і ячэйкам правесьці ў першай палове лютага адзіны партдзень для распрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў па ажыццяўленьню гэтай пастановы і праверкі сапраўднага становішча па правядзеньню беларусізацыі, работы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню, абслугоўваньня нацменшасьцяў, сьмела і рашуча выкрываючы апартуністычныя, шавіністычныя, перараджэнцкія элемэнты, якія прыкрываюцца фальшыва-нацыянальным сьцягам.

4. Пленум адзначае выключна слабую работу камсамольскай арганізацыі ў галіне ажыццяўленьня ленінскай нацпалітыкі і вельмі нязначную ролю яе ў нацкультбудаўніцтве і даручае бюро ГК КП(б)Б і ЛКСМБ правесьці масавую праверку ўдзелу камсамольскай арганізацыі ў нацкультбудаўніцтве і прыняць практычныя меры, неабходныя для ліквідацыі азначанага прарыву і ўзмацненьня барацьбы з вялікадзяржаўніцкімі, нацдэмаўскімі і іншымі шавіністычнымі элемэнтамі ўнутры камсамольскай арганізацыі.

5. Пленум канстатуе зусім дрэнную пастаноўку прапаганды нацыянальнай палітыкі партыі, няўжываньне ў прапагандысцкай і агітмасавай рабоце яснага і чоткага паказу практычных рэзультатаў ажыццяўленьня партыяй сваёй нацпалітыкі, наяўнасьць упрашчэнства і вульгарызацыі ў прапагандзе і вывучэньні нацпалітыкі ў сетцы парткамсамольскай асьветы і навучальных установах і абавязвае:

а) **культпроп ГК** на працягу лютага правесьці масавую і дасканалую праверку вывучэньня нацпалітыкі ў навучальных установах і сетцы парткамсамольскай асьветы, забясьпечыць чыстату ленінскай лініі ў выкладаньні і барацьбу са ўсялякімі скажэньнямі марксыцка-ленінскай тэорыі і нацпалітыкі;

б) **фракцыі ГСПС, інспэктарыяту палітасьветы і ўсім парт'ячэйкам і калектывам** забясьпечыць уключэньне ў штодзённую работу клюбаў і хат-чытальняў папулярызацыю і растлумачэньне нацпалітыкі партыі, ілюстраваньне перад шырокімі масамі дасягненьняў гаспадаркі і культурнага разьвіцьця БССР і раёну, фактычнага становішча эканамічнага і культурнага заняпаду ў Зах. Беларусі, як выніку фашысцкай дыктатуры, арганізацыю шырокай растлумачальнай і мабілізуючай работы навакол кожнага факта шавіністычных вылазак і выкрыцьцё іх клясавай сутнасьці; **бюро ГК** у месячны тэрмін распрацаваць мерапрыемствы па паляпшэньні работы хат-чытальняў.

6. **У ГАЛІНЕ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ:**

а) абавязаць фракцыю гарсавету, Акімава (кантора сувязі), Фельдмана (кіраўніцтва трамваю), Эстрына (банк), Бабіцкага (ашчадкаса), Васільлева (нач. станцыі МБВ), Гіцовіча (ЦРК), Кома (ТСТ), Бэйліна (Белгандаль) і ўсіх **старшынь ЗРК** бязадкладна забясьпечыць абслугоўваньне насельніцтвам на беларускай мове, здымаючы з працы тых работнікаў, якія супраціўляюцца правядзеньню гэтага мерапрыемства; разам з тым, расставіць сілы апарату па перыфэрыі з такім разьлікам, каб было забясьпечана абслугоўваньне наведвальнікаў на іх роднай мове;

б) нацкамісіі забясьпечыць сыстэматычную праверку ўжываньня белмовы ва ўсіх установах, гаспадарчых і іншых ворганах, жорстка змагаючыся з фармальным падыходам да гэтай справы, як адной з форм праяў вялікадзяржаўнага шавінізму на практыцы, у прыватнасьці, праверыць укараненьне беларускай мовы па заводакіраўніцтвам—„Сьцягу індустрыялізацыі", „Дзьвіны", фабрыкі імя Цэткін, „Чырвонага металіста", акулярнай, па апаратам прамкаапэрацыі, ЦРК, ТСТ і па апарату чыгункі, дзе ў сучасны момант становішча з беларусізацыяй асабліва дрэннае;

в) абавязаць усе парткалектывы і ячэйкі бязадкладна на справе забясьпечыць работу партыйных, прафсаюзных, гаспадарчых апаратаў на беларускай мове, разгарнуць масавую работу па арганізацыі на добраахвотных пачатках вывучэньня беларускай мовы рабочымі прадпрыемстваў, што ў апошнія часы значна паслабла, прычым у гэтай рабоце неабходна забясьпечыць выкананьне дырэктывы сававіцка-га пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, які прапанаваў падняць работу ў галіне беларусізацыі на больш высокую ступень, забясьпечыўшы вывучэньне ня толькі беларускай мовы, але і эканомікі, культуры, быту, гісторыі, літаратуры БССР.

7. **У ГАЛІНЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ НАЦМЕНШАСЬЦЯЎ І ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАНЬНЯ:**

а) абавязаць фракцыі гарсавету і ГСПС у двухмесячны тэрмін забясьпечыць арганізацыю ў горадзе інтэрнацыянальнага клюбу, уліўшы ў яго існуючыя клюбы асобных нацменшасьцяў;

б) культпропу і агітмасу ГК і парт'ячэйкам забясьпечыць безадкладны пералом у галіне масавай работы сярод працоўных нацменшасьцяў;

в) парткалектывам і ячэйкам узяць на сябе ўсю поўнату адказнасьці за становішча мопраўскай работы на прадпрыемствах і ў сельсаветах, забясьпечыць актывізацыю яе, арганізаваць і кіраваць сыстэматычнай пераніскай рабочых прадпрыемстваў Віцебшчыны з зарубежнымі пралетарамі, скарыстоўваючы яе ў якасьці моцнай формы інтэрнацыянальнага выхаваньня;

г) фракцыі ГСПС падагуліць вопыт правядзеньня інтэрнацыянальных вечароў на акулярнай фабрыцы і «Сьцягу індустрыялізацыі», распаўсюджыўшы яго па ўсіх прадпрыемствах.

8. **У ГАЛІНЕ ШКОЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА.** Пленум адзначае зусім слабае партыйнае кіраўніцтва ўнутрышкольным жыцьцём, асабліва ў сэнсэ забясьпечэньня марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі ў выкладаньні, асваеньня студэнтамі і вучнямі асноў ленінскай нацпалітыкі і правільнага скарыстаньня кадраў, канчаючых навучальныя ўстановы (пэдінстытут, вэтінстытут, мэханічны тэхнікум, мастацкі тэхнікум, садова-гародні тэхнікум, ФЗВ чыгуначнікаў) і лічыць неабходным:

а) **культпропу ГК** забясьпечыць ажыццяўленьне непасрэднага партыйнага кіраўніцтва практычнай работай па нацкультбудаўніцтву, па барацьбе за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію выкладаньня, за партыйнасьць навукі, усімі пытаньнямі школьнага будаўніцтва;

б) **культпропу ГК** на працягу месяца правесьці шырокую праверку мэтадалёгіі выкладаньня, падручнікаў і наогул становішча навукова навучальнай работы ў ВНУ;

в) забясьпечыць чоткае вывучэньне ва ўсіх навучальных установах асноў ленінскай нацпалітыкі;

г) **гарАНА і дырэктарам навучальных установ** забясьпечыць рашучае паляпшэньне выкладаньня беларускай мовы ў пачатковых, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, ліквідаваўшы ў найкратчэйшы тэрмін граматычную няпісьменнасьць вучняў школ, тэхнікумаў і ВНУ.

9. **У ГАЛІНЕ ДРУКУ І РАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ БЕЛАРУСКАЙ І НАЦМЕНАЎСКАЙ ЛІГАРАТУРЫ:**

а) адзначаючы вялікі рост колькасьці і тыражу друкаваных газэт па гораду, пленум канстатуе рэзкае адсталаньне ад гэтага росту паліграфічнай базы і даручае фракцыі гарсавету і т. Ханіну забясьпечыць своечасовае і добраякаснае будаўніцтва новай друкарні;

б) рэдакцыі «Віцебскага пралетара», над адказнасьць тав. Розенблюма, актывізаваць работу газэты ў галіне барацьбы за ленінскую нацпалітыку і нацкультбудаўніцтва і сыстэматызаваць выпуск старонак на яўрэйскай, польскай і латыскай мовах, разгарнуўшы масавую работу сярод рабкораў нацменшасьцяў;

в) катэгарычна абавязаць тав. Анташэўскага (гарбюро саюздруку) і сэкратароў парткалектываў і ячэек выканаць рашэйшыя пастановы гаркому аб масавай рабоце па распаўсюджваньню беларускага і нацменаўскага друку;

г) абавязаць фракцыю ГСПС і гарАНА забясьпечыць сыстэматычнае папаўненьне бібліятэк беларускімі і нацменаўскімі выданьнямі і сыстэматычную праверку кніжных фондаў з мэтай выняцьця ідэалёгічна-шкодных выданьняў, прыцягваючы вінаватых у прасоўваньні іх у масы да самай суровай партыйнай і судовай адказнасьці;

д) кнігаганалюючым арганізацыям забясьпечыць прасоўваньне ў масы беларускай і нацменаўскай літаратуры.

10. **У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА:**

а) пленум канстатуе зусім слабую перабудову пісьменьніцкай арганізацыі Віцебшчыны і абавязвае **культпроп ГК** узмацніць работу аргкамітэту саюзу савецкіх пісьменьнікаў, забясьпечыўшы ўздым творчай дзейнасьці і разгортваньне масавай работы на прадпрыемствах, у савгасах і калгасах; лічыць неабходным рэалізацыю творчасьці савецкіх пісьменьнікаў Віцебшчыны праз сыстэматычнае выданьне асобных зборнікаў іх твораў;

б) адзначаючы вельмі нябясьпечнае ідэалёгічнае становішча на вучастку самадзейнага мастацтва па Віцебшчыне, пленум абавязвае нацкамісію, фракцыю ГСПС і культпроп ГК забясьпечыць поўнае ажыццяўленьне пастановы гаркому аб становішчы на мастацкім фронце;

в) пленум лічыць, што адсутнасьць масавай работы па арганізацыі рабочага глядача і палітычнай увагі ВДТ-2 зьяўляецца вынікам вялікадзяржаўніцкіх адносін раду кіруючых работнікаў прадпрыемстваў да нацыянальнай па форме сацыялістычнай культуры і абавязвае фракцыю ГСПС павесьці самую рашучую барацьбу з гэткімі фактамі;

г) пленум абавязвае культпроп ГК і фракцыю ГСПС разгарнуць работу ў масах па папулярызацыі пытаньняў мастацтва і літаратуры, набліжаючы масы да гэтых пытаньняў, накіроўваючы іх на аўладаньне вышынямі кіраўніцтва нацкультбудаўніцтвам і на жорсткую барацьбу з шавіністычнымі і наогул клясава-варожымі элемэнтамі і іх вылазкамі на гэтым вучастку; увесьці ў практыку канфэрэнцыі глядачоў тэатру і кіно-мастацкія выстаўкі, музычныя канфэрэнцыі, лекцыі і г. д.;

д) пленум абавязвае фракцыю гарсавету ў дэкадны тэрмін прадпрыняць практычныя мерапрыемствы па такому абсталяваньню будынку тэатру, каб ён сапраўды адпавядаў культурным запатрабаваньням рабочых мас, а таксама складзі прочную матар'яльную базу для работы ТРАМ.

11. Пленум адзначае яўна нездавальняючую работу нацкамісіі гарсавету, якая не забясьпечыла сыстэматычную і няўхільную барацьбу за выкананьне дырэктыў партыі па ажыццяўленьню ленінскай нацпалітыкі, па барацьбе з праявамі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на данным этапе, з беларускай нацдэмаўшчынай і шавінізмам іншых масьцей, па шырокаму бальшавіцкаму разгортваньню нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў горадзе і раёне. Пленум падкрэсьлівае, што нацкамісія праводзіла сваю работу павярхоўна, не ўскрываючы прычын скажэньняў і недахопаў у ажыццяўленьні нацпалітыкі, не разгортваючы масавай работы на мясцох, не вызначаючы палітычна-чоткіх і канкрэтных дырэктыў.

Выходзячы з гэтага, пленум пастанаўляе:

а) сучасны склад нацкамісіі распусьціць і прасіць гарКК прыцягнуць віноўных у зрыве работы нацкамісіі да суровай партадказнасьці;

б) **бюро ГК** і фракцыі гарсавету выдзяліць нацкамісію ў такім складзе, які-б забясьпечыў чоткую няўхільную і непрымірымую барацьбу за ленінскую нацыянальную палітыку нашай партыі, сыстэматычнае плянаванне, дэталёванае і паглыбленае вывучэньне становішча на асобных вучастках нацработы і нацкультбудаўніцтва, сталую і чоткую праверку на ўсіх вучастках і зьвеньнях выкананьня дырэктыў партыі па ажыццяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі.

12. Пленум пастанаўляе праз два месяцы склікаць кантрольны пленум ГК для дэталёвай праверкі выкананьня гэтай пастановы.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ЎЗЬНЯЦЬЦІ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ.

Рэзалюцыя студзеньскага пленуму гаркому КП(б)Б.

I.

1. У рэзультаце пасьпяховага завяршэньня першай пяцігодкі СССР ператварыўся ў перадавую тэхніка-эканамічную краіну. На аснове бурнага росту індустрыі, падвядзеньня індустрыяльнай базы пад сельскую гаспадарку СССР з краіны дробна-сялянскай ператварыўся ў краіну самага буйнага земляробства. «Пасьпяхова праводзіцца палітыка ліквідацыі кулацтва, канчаткова падарваны карэньні капіталізму ў вёсцы, зьнішчана магчымасьць расслаеньня сялянства. Мільённыя масы беднякоў і сераднякоў упяршыню ў гісторыі вызвалены ад кулацкай кабалы, жабрацтва і нявуцтва».

На гэтай аснове завершона першая стадыя ўзьдыму сельскай гаспадаркі, найбольшае пашырэньне насеўных плошчаў. Перад партыйнай арганізацыяй паўсталі новыя задачы, якія вызначаюцца наступным паказаньнем ЦК УсеКП(б): «Наступіў час, калі ад росту гаспадаркі ў шырыню шляхам павялічэньня насеўных плошчаў, неабходна павярнуць да барацьбы за лепшую апрацоўку зямлі, да барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на даннай стадыі разьвіцьця».

2. Пленум прызнае нездавальняючай работу гарЗА, МТС, ЦРК і заводакіраўніцтваў у галіне барацьбы за падвышэньне ўраджайнасьці і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Такое становішча тлумачыцца тым, што многімі гарадзкімі і сельскімі арганізацыямі ня ўлічаны вурокі севу 1932 г., памылкі і недахопы хлебазагатоўчай кампаніі, не надалі з першых-жа дзён належнага размаху падрыхтоўцы да сяўбы, не даацэньваюць новай абстаноўкі і новых формаў клясавай барацьбы, абвастрыўшайся на сучасным этапе. У выніку адсутнасьці канкрэтнай увагі да задач падрыхтоўкі да севу, адсутнасьці штодзённага аператыўнага кіраўніцтва з боку Земаддзелу, МТС, парт'ячэек і саветаў, да гэтага часу не засыпаны яшчэ поўнасьцю насенныя фонды, не разгорнут рамонт інвэнтару (засыпана зерновых 79 проц., страхфондаў—56,4 проц., вікі—76 проц., страхавых—55 проц., бабовых—71,6 проц., бульбы—95,7проц., страхавых—58,9 проц., ільнонасеньня—77 проц., страхавых—87,6 проц. і канюшыны толькі—14,2 проц. На 20-е жніўня адрамантавана інвэнтару: плугоў—19 проц., барон—9 проц., сеялак—8 проц., цалег—9 проц., упражы—21 проц.).

Пайбольш ганебнае адсталаньне ў падрыхтоўцы да севу паказваюць Бабініцкі, Рудакоўскі, Старасельскі і Машканскі сельсаветы. Асабліва пагражаючым гарком лічыць становішча з падрыхтоўкай сяўбы і асваеньнем прыгарадных гаспадарак, за што ўся адказнасьць кладзецца на дырэктароў, сэкратароў парткалектываў і старшынь ФЗМК: «Сьцягу», імя Цэткін, КІМ, МБВ, «Чырвоны металіст», „Дзьвіна", шчаткомб, «Прафінтэрн», фанэрны, лесазавод імя Правды, Лекерта, акулярнай, скурзаводу, ЦРК і інш.

Абавязаць дырэктароў прадпрыемстваў і фракцыі гарсавету на працягу 3-х дзён вытварыць канчатковую перадачу калгасаў прадпрыемствам.

3. Пленум ГК з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што бальшавіцкая падрыхтоўка да сяўбы, бальшавіцкае выкананьне задачы ўздыму ўраджайнасьці будзе забясьпечана сапраўднай рэалізацыяй гістарычных паказаньняў т. Сталіна, што «калгасны лад ня зьніжае, а павышае клопаты і адказнасьць партыі і ўраду ў адносінах разьвіцьця сельскае гаспадаркі», яго паказаньняў аб 5 асноўных недахопах у рабоце на вёсцы, гэта значыць: партыйная арганізацыя павінна бальшавізаваць калгас, ведаць дасканала кожную гаспадарку, ведаць людзей, дасканала аўладаць пытаньнямі калгаснага будаўніцтва, ведаць хітрыкі і манэўры клясавага ворага, які пралазае ў калгасы, строгая клясавая пільнасьць, пралетарская загартаванасьць і шырокае аўладаньне пытаньнямі агразоотэхнікі.

Выходзячы з гэтага, пленум ГК пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць агульную плошчу яравога кліну па раёну на 1933 г. 38.000 га, з іх: зерновых культур—17.743 га, бульбы—8.502 га, гародніны—2.706 га, ільну—1.100 га і астатніх—7.948 га. Забясьпечыць гэтую плошчу севу ўласнымі і насеннымі рэсурсамі выключна адсартаваным насеньнем (насенстрахфонды) (тэрмін—1-га лютага).

Пленум абавязвае калгасна-зямельныя органы дабіцца збору насенфондаў для поўнага выкананьня прызначаемай плошчы пад гародніну (тэрмін—20-га лютага).

Пленум зварачвае ўвагу арганізацыі на ўсю адказнасьць справы засыпкі насенстрахфондаў, што асабліва востра паўстае ў сувязі з дазволам БССР гандляваць хлебам.

2. Абавязаць фракцыю гарсавета на працягу 5-ці дзён устанавіць заданьні па ўраджайнасьці па раёну і давесьці іх да кожнага савгасу, баапгасу і калгасу—на працягу 1½—2 дэкад.

3. Пленум гаркому зварачвае ўвагу ячэек, сельсаветаў, праўленьняў калгасаў і камуністаў, працуючых у савгасах і калгасах, што рэалізацыя дырэктыў партыі і ураду па ўздыму ураджайнасьці патрабуе сур'ёзьнейшай і настойлівай барацьбы за гэта, барацьбы з кулацкімі манэўрамі, на зрыў важнейшага мерапрыемства, улічваючы, што «самацёк цяпер больш, чым калі небудзь, небясьпечны для справы разьвіцьця сельскай гаспадаркі», выходзячы з чаго:

а) сеў праводзіць выключна адсартаваным і пратручаным насеньнем. Усяго адсартаваць 42685 цэнт., пратруціць перад насевам 20450 цэнт. (тэрмін—15 лютага).

б) земаддзелу і МТС выявіць усю наяўнасьць гатунковага, вага і палепшанага насеньня па раёну, поўнасьцю яго захаваць і арганізаваць апробацыю гатунковых насеваў 1933 году з мэтай забясьпячэньня на працягу 2—3 год чыстагатунковымі і палепшанымі насенфондамі ўсіх відаў савгасаў, баапгасаў і калгасаў;

в) устанавіць наступны працяг сяўбы: на зернавых—12 дзён, па бульбе і каранплодах—15 дзён;

г) вытварыць рэдкавы сеў зернавых культур на плошчы ня менш 3000 га і насадку бульбы пад маркёр—2200 га, з іх: па савгасах—200, па баапгасах—350 і калгасах—1650;

д) вывесьці натуральнага гною ў зімовы час 414 тыс. вазоў, сабраць 1000 тон попелу, затарфаваць 220 га, завапнаваць 410 га і скарыстаць, акрамя гэтага, усе мясцовыя рэсурсы і адыходы.

Даручыць земаддзелу ў 5 дзён зрабіць разьмеркаваньне адыходаў і іх вывазку паміж баапгасамі і калгасамі;

е) на раду з арганізацыяй завозу складаных і поўскладаных сельска-гаспадарчых машын асаблівы ўпор узяць на поўную нагрузку маючагася сел.-гасп. інвэнтару, на яго захаваньне і поўнае адрамантаваньне. Абавязаць бюро ГК, фракцыю гарсавету і кіраўніцтва МТС забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва выкананьнем пляну рамонту да 1 сакавіка.

Адказнасьць за рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару ўскласьці на гарЗА, МТС, кіраўніцтва заводаў «Чырвоны металіст», «Камінтэрн», аўтабазы, старшынь саветаў і калгасаў;

ж) прыняць да ведама паведамленьне фракцыі гарсавету, што па 11-ці сельсаветах праведзена земляўпарадкаваньне і ўстаноўлены палі севазвароту. Абавязаць Земаддзел і МТС да 20 лютага скласьці пераходныя таблічны чарговасьці культур па савгасах, баапгасах і калгасах гэтых сельсаветаў з такім разьлікам, каб давядзенье вытворчых заданьняў па сяўбе цалкам адпавядала прыняцьцю агульнай арганізацыі севазвароту. Да пачатку севу дадаткова земляўпарадкаваць Машканскі і Замасточкі сельсаветы і за летні час—Мікалаёўскі і Міхалёўскі сельсаветы;

з) для захаваньня конскага пагалоўя і яго працаздольнасьці ўстанавіць на кожнаму савгасу і калгасу для каня поўны дзень адпачынку, ліквідаваць абязьлічку ў яго паў сядзённым скарыстаньні і забясьпечыць жорсткі кантроль за выдачай каню ўстаноўленай нормы—рацыёну і падгонкай адпаведнай упражы;

і) арганізаваць работу па асваеньні засаджаных у апошнія гады садоў, па догляду за імі, па абрэзцы і апрысківаньні ўсіх садоў савгасаў і калгасаў (асабліва калгасаў імя Молатава, Мархлеўскага, Чырвонай арміі і Бароза), увязваючы гэту работу з агульнай барацьбой за сяўбу, за ўраджайнасьць.

4. У поўнай адпаведнасьці з гэтымі задачамі па правядзеньні сяўбы і барацьбе за ўраджайнасьць павінны быць пабудаваны вытворчыя пляны савгасаў і калгасаў. Абавязаць гарЗА і МТС скончыць складаньне паказаных плянаў да 10 лютага. Вытворчыя пляны калгасаў павінны адлюстроўваць усю работу вытворчых брыгад з тым, каб да 10 лютага брыгада і брыгадзір ведалі свае вучасткі, іх разьмеркавалі на культурах, каб была вызначана канкрэтная задача кожнага калгасьніка.

5. Пленум папярэджвае партарганізацыі, што кулак у яго антысавецкай рабоце будзе імкнуцца арганізаваць сабатаж сяўбы, ажыццяўленьне мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці, у першую чаргу з боку адпаведнай, што ўскладае на партячэйкі і сельсаветы ўсіх камуністаў ад-

(КАНЕЦ НА 3-й СТАР.).

РЭЗАЛЮЦЫІ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ГАРКОМУ КП(б)Б

Аб падрыхтоўцы да сяўбы і мерапрыемствах па ўзьняцьці ўраджайнасьці.

зьнейшыя задачы па арганізацыі сяўбы і абавязвае ячэйкі, сельсаветы і зямельны аддзел поўнасьцю ахапіць кіраўніцтвам і ўзьдзейнічаньнём на выкананьне пасеўнага пляну аднаасобным сэктарам, улічваючы, што рашаючую ролю ў сяўбе аднаасобнікаў адыгрывае член сельсавету, работа з ім і ўзьняцьцё яго адказнасьці.

Практычнымі задачамі зямельных органаў і сельсаветаў па падрыхтоўцы да сяўбы аднаасобнікаў пленум лічыць:

а) сканчэньне да 15-га лютага земляпаказаньняў;

б) давядзеньне да 15-га лютага пляну сяўбы да кожага аднаасобніка;

в) арганізацыю дапамогі і ўвязкі сяўбы паміж калгасамі і аднаасобнікамі.

6. Пленум гаркому даручае калгасна зямельным органам зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне пляну сяўбы па парніках і раньняй бульбе, што ва ўмовах нашага агараднага раёну адыгрывае вялікае значэньне.

II.

1. Правядзеньне мерапрыемстваў па веснавой сяўбе і па ўзьняцьцю ўраджайнасьці яшчэ больш арганізацыйна-гаспадарча ўмацуе калгасы і зробіць вялікі крок па шляху іх бальшавізацыі. Асаблівую і выключную ролю ў гэтым набывае перабудова ўсёй работы партячэек, МТС і савгасаў з палітаддзеламі, камсамолу і савецтаў. Пленум гаркому лічыць, што зараз, як ніколі, патрэбна асаблівая маналітнасьць і згуртаванасьць партыйнай арганізацыі і асабліва яе вясковых зьвеньняў, ачыстка яе (да чысткі і ў час чысткі) радоў партыі ад кулацкай агэнтуры, ад перараджэнцаў, ад апартуністаў, ад гніла-лібэральных элемэнтаў. Вясковыя партячэйкі і сельсаветы, абгаварваючы мерапрыемствы па веснавой сяўбе, абавязаны так расставіць сілы камуністаў, камсамольцаў і беспартыйнага актыву, каб усе вучасткі барацьбы за сеў былі ахоплены партыйным уплывам, каб была ўмацавана калгасная вытворчая брыгада — асноўнае зьвяно барацьбы за высокі ўраджай, за ўшчыльненьне тэрміну сяўбы. Гэтыя мерапрыемствы павінны праводзіцца ў поўнай адпаведнасьці з рашэньнямі апошняга пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, з поўным улікам асаблівасьцяй асобнага калгасу, брыгады і асобных вёсак.

2. Высунутыя ў гістарычнай прамове т. Сталіна пяць асноўных недахопаў нашай работы на вёсцы павінны зьявіцца на справе баявой праграмай перабудовы ўсіх зьвеньняў гарадзкіх і сельскіх арганізацый. Пленум гаркому завастрае ўвагу ўсіх камуністаў на неабходнасьць узьняцьця сваёй ролі і адказнасьці за правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў, зьвязаных з правядзеньнем сяўбы і яе цэнтральнай задачай—уздымам ураджайнасьці. Гэтага партарганізацыя можа дабіцца толькі ў тым выпадку, калі будзе ўзмацнёна рэвалюцыйная пільнасьць кожнага камуніста, кожнага камсамольца і калгаснага актывіста ў барацьбе з кулацкім, антысавецкім элемэнтам, з іх варожымі махінацыямі ў барацьбе за ачыстку калгасаў і ў першую чаргу іх кіруючых органаў і рахункавага апарату ад кулакоў і антысавецкіх элемэнтаў.

3. Пленум гаркому КП(б)Б завастрае ўвагу ўсёй партарганізацыі на выключнае значэньне выданага закону «аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве» у справе пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы: новы закон стымулюе поўнае выкананьне плянаў сяўбы калгасамі і аднаасобнікамі і ўзьняцьцё ўраджайнасьці, абавязвае першачарговаму выкананьню іх абавязкаў перад дзяржавай, адкрываючы велічэзьнейшыя пэрспэктывы далейшаму арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў, павялічэньню таварнасьці сельскай гаспадаркі і разгортваньню калгаснага гандлю.

Абавязаць бюро ГК і партячэйкі правесьці шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў аб значэньні і сутнасьці новага закону.

4. Зьвярнуць увагу ўсіх арганізацый гораду і вёскі на неабходнасьць валадзжваньня работы з калгасным актывам, яго выхаваньнем на канкрэтных пытаньнях работы, яго палітычным выхаваньнем на ажыцьцяўленьне лёзунгаў партыі, на правядзеньне сталай работы вытворчых нарад.

На частцы падрыхтоўкі калгасных кадраў зацьвердзіць наступныя мерапрыемствы:

а) На лініі МТС—падрыхтоўка 75 трактарыстаў і перападрыхтоўка 25 трактарыстаў;

б) па лініі райземаддзелу—перападрыхтоўка старшынь і рахункаводаў калгасаў на 75 асоб, у апорных калгасах—0 брыгадзіраў, загадчыкаў МТФ і СТФ, 30 пчаляроў і раённыя курсы вэтсанітараў на 35 асоб. Арганізаваць двухдэкадныя курсы - нарады ў сельсаветах па аўладаньні агразоотэхнікай на 500 асоб, праз агразоотэхнічныя гурткі непасрэдна ў калгасах 225 асоб па жывёлагадоўлі і гародніцтву;

в) па лініі ініцыятыўных мерапрыемстваў рэдакцыі «Віцебскі пралетары» курсы-нарады канюхоў (30 чал.), садаводаў (30 чал.) і калгасьнікаў па аўладаньні тэхнікай маркераў і сеялак (50 чал.).

Абавязаць Культпроп і Агітмас ГК, гарЗА і МТС распачаць правядзеньне курсаў не пазьней 5-га лютага.

5 Гарком звяртае ўвагу ўсёй арганізацыі і калгасна-зямельных органаў на неабходнасьць разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва у МТФ, савгасах і калгасах, змагаючыся з дэкларацыйнасьцю, робячы сацспаборніцтва і ўдарніцтва дзейснымі формамі і мэтадамі барацьбы за якасьць пасеву, за кожны га пасеву, за ўздым ураджайнасьці. Вясковыя арганізацыі павінны паставіць работу так, каб ударнік быў у цэнтры ўсяго калгасу, а яго ўдарныя тэмпы—асноўным вымернікам для работы ўсіх калгасьнікаў. Канкрэтнасьць і дзейснасьць сацыялістычнага спаборніцтва забясьпечаць кароткія тэрміны сяўбы і рэалізацыю намечаных гаркомам яе плянаў.

6. Гарком канстатуе нездавальняючую работу нізавога друку савгасаў і калгасаў і абавязвае парт'ячэйкі скарыстаць правядзеньне адзінага партдню аб друку для ўзьняцьця яго работы з тым, каб кожная насьценная газэта завойстрана, у адпаведнасьці з паказаньнямі «Праўды» у перадавым артыкуле «Задачы савгасных і калгасных газэт у новай абстаноўцы», змагалася за сяўбу, за ўраджай.

Абавязаць культпроп і рэдакцыю правесьці спэцыялізаваныя нарады рэдактароў насьценных газэт і селькораў.

7. З 15 лютага па 1 сакавіка правесьці масавую праверку гатоўнасьці раёну да сяўбы, завяршыўшы гэту праверку раённым зьлётам дырэктароў савгасаў, калгасаў, старшынь і брыгадзіраў калгасаў.

8. Даручыць бюро ГК і фракцыю гарсавету на працягу 5-ці дзён прагледзець пэрсанальны склад апарату земаддзелу і арганізаваць больш рацыянальнае скарыстаньне аграспэцыялістаў.

9. Даручыць бюро гаркому распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва, дапамогу і нагляд за правядзеньнем падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы.

10. Пленум гаркому прапануе шэфствуючым арганізацыям гораду неадкладна ўключыцца ў баявую работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і асабліва падкрэсьлівае надзвычай адказныя задачы партарганізацый акулярнай фабрыкі і іголкавай, «Чырвонага мэталіста», службы цягі МББ, заводу «Камінтэрн», у сувязі з неабходнасьцю зьдзейсьненьня пралетарскага вытворча-тэхнічнага шэфства над машынна-трактарнымі станцыямі і машынна трактарнымі майстэрнямі.

Лічыць мэтазгодным арганізацыю вытворча-тэхнічнае шэфства над віцебскай МТС з боку аўтабазы і дэпо трамваю.

Пленум гаркому лічыць, што выкананьне плянаў веснавой сяўбы 1933 году з пункту гледжаньня ажыцьцяўленьня ўзятага віцебскай партарганізацыяй на сябе абавязку зробіць Віцебскі раён раёнам узорнага земляробства, магчыма толькі пры той умове, калі будзе перабудавана работа гарадзкіх арганізацый (і гаркому, і гарсавету, і гарпрафсавету, і гаркому КСМ, і кіраўніцтва МТС) такім чынам, каб барацьба за плян сяўбы праходзіла пры поўным веданьні ўмоў і асаблівасьцяй кожнага калгасу, калгаснай брыгады і насялёнага пункту. Пленум гаркому заклікае ўсю партарганізацыю адразу-ж узяцца за рэалізацыю рашэньняў пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) за рашучае выпраўленьне тых недахопаў у рабоце, якія з усёй бальшавіцкай праматой выкрыты і падкрэслены ў гістарычнай прамове т. Сталіна на пленуме ЦК і ЦКК.

Гарком заклікае ўсю партарганізацыю на рашучую барацьбу за рэалізацыю намечаных мерапрыемстваў супроць малейшых спроб панізіць тэмпы падрыхтоўкі і самога севу, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на данным этапе, супроць іх «левых» дапаможнікаў, супроць усіх тых элемэнтаў, якія сваю контррэвалюцыйную дзейнасьць прыкрываюць фальшывым нацыянальным сьцягам.

СТАНОВІШЧА ВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК САЮЗУ АД 15-га ЛІСТАПАДА 1932 Г. ПА БАРАЦЬБЕ З ПРАГУЛАМІ І ЦЯКУЧАСЬЦЮ РАБСІЛЫ.

Рэзалюцыя студзеньскага пленуму гаркому КП(б)Б.

1. Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, на чале з т. Сталіным, Савецкі Саюз пасьпяхова закончыў першую пяцігодку, якая ператварыла СССР з краіны аграрнай з мільённымі дробнымі сялянскімі гаспадаркамі ў краіну індустрыяльную, на падставе навейшай тэхнікі, аўладаньне якой зьяўляецца важнейшай справай партыі і рабочага клясы.

Сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва характарызуецца хуткім ростам матар'яльна-тэхнічнай базы індустрыі, асабліва настойліва патрабуе бальшавіцкага ўменьня палучаць барацьбу за аўладаньне тэхнікай, аўладаньне вытворчасьцю з барацьбой за «павышэньне дысцыпліны працоўных, уменьне працаваць, спорасьці інтэнсыўнасьці труду» (Ленін).

Уліўшаяся за апошнія гады маса новых рабочых з вёскі і гарадзкой дробнай буржуазіі ў вытворчасьць, якія не прайшлі яшчэ школы калектыўнага труда ў значнай частцы зьяўляюцца праваднікамі дробна-буржуазнага ўплыву на пралетарыят і дэзарганізуюць вытворчасьць, шляхам прагулаў, перабежкі з аднаго прадпрыемства на другое, шукаючы, дзе можна «урваць кусок пабольш і ўдраць».

Прагульшчык—гэта вораг сацыялізму, ухіляючыся ад працы, сваёй дэзарганізатарскай і разлагаючай работай ён дапамагае клясаваму ворагу. Бязьлітасная барацьба з дэзарганізатарамі вытворчасьці, ізгнаньне іх з прадпрыемстваў, выхаваньне новых кадраў з адсталых слаёў пралетарыяту і перапрацоўка іх сьвядомасьці зьяўляецца важнейшай задачай.

Пленум адзначае нездавальняючае становішча працдысцыпліны па прадпрыемствам Віцебску і ў прыватнасьці па шчоткамбінату, фанэрнаму заводу і фабрыцы «КІМ», што характарызуецца наступнымі лічбамі: прагулы па неўважлівым прычынам складаюць у ліпені—2,7 проц., жніўні—2,7 проц., верасьні—3,3 проц., кастрычніку—.5 проц., лістападзе—2,3 проц, што зьяўляецца аднэй з прычын ганебнага невыкананьня прамфінпляну (па 16 ці прадпрыемствах рэспубліканскай прамысловасьці за 1932 г. выканан прамфінплян на 87,08 проц., па мясцовай—67.6 проц.—лічбы папярэднія).

Па шчаткомбу: ліпень—2,1 проц., жнівень—4,5 проц., верасень—5,7 проц., кастрычнік—5,5 проц., лістапад—4,7 проц., сьнежань 1,4 проц.

Па ф-цы „КІМ“ ліпень—8,7 проц., жнівень—10,3 проц., верасень—10 проц., кастрычнік 8,6 проц., лістапад 3,7 проц. і сьнежань 3,7 проц.

Лібэральныя адносіны да прагульшчыкаў зьяўляюцца аднэй з праяў правага апартунізму, што мае месца з боку многіх дырэкцый фабрык і заводаў і ў асаблівасьці дырэктароў па працы, напрыклад: па ф-цы „КІМ“ на працягу сьнежня месяца заг. цэхамі зволены за прагулы, але зноў васстаноўлены загадчыкам кадрамі т. Літвінавай (Содава прагуляла 2 тыдні, Марудава—3 дні, Дубікава—3 дні, Жукава—3 дні і г. д.).

Па фанэрнаму заводу зволеная за прагул работніца Сімакова адміністрацыяй васстаноўлена.

Па шчаткомбу Грыгор'еў, прагуляўшы 8 дзён, Борак 4 дні, таксама васстаноўлены на рабоце.

Адсутнасьць належнай бальшавіцкай пільнасьці пры прыёме рабочых і належнай праверкі іх, прывяла да значнай засьмечанасьці прадпрыемстваў і ўстаноў кулацка-варожым элемэнтам. Гэтаму спрыяюць апартуністычныя дзеляцкія адносіны раду кіраўнікоў,—партыйцаў, прымаючых на работу любога, абы запоўніць пустое месца.

Пленум адзначае яўна нездавальняючае становішча вучота выхаду і нявыхаду на работу, што спрыяе павялічэньню колькасьці прагулаў і складае ўмову бясьпекі для прагульшчыкаў. Прыкладам безабразнай пастаноўкі вучоту зьяўляецца «Чырвоны мэталіст».

Ня гледзячы на яскравае паказаньне ў пастанове ЦВК і СНК аб ізьяцьці наборных дакумантаў у звальняемых прагульшчыкаў, многімі прадпрыемствамі гэта ня выконваецца. Напрыклад: па шчаткомбу—1-І 1933 г. паведамлёна аб звальненьні і затрыманьні картак на 89 асоб, фактычна з іх затрымана толькі 15. 13 І 33 г. паведамлёна на 11 асоб—затрымана ў 2-х асоб і г. д.

Такія апартуністычныя адносіны да правядзеньня прамых паказаньняў партыі і ўраду нецярпімы.

Выпадкі масавага звальненьня без правядзеньня масавай работы (фанэрны завод—15-XII-32 г. загадам № 227 звольніў 16 асоб за сыстэматычныя прагулы, што зьяўляецца грубым скрыўленьнем лініі партыі ў правядзеньні гэтай пастановы).

Таварыскія суды—асноўная функцыя якіх зьяўляецца барацьба з дэзарганізатарамі вытворчасьці, да гэтага часу зусім бязьдзейнічаюць.

Пленум адзначае, што растлумачэньне пастановы ЦВК і СНК па большасьці прадпрыемстваў праходзіла фармальна, абмяжоўваючыся на правядзеньні мітынгаў. Парт і прафкіраўніцтва прадпрыемстваў да гэтага часу не ўзяліся па-бальшавіцку за правядзеньне гэтага важнейшага мерапрыемства па аздараўленьню вытворчасьці, што пацьвярджаецца адсутнічаньнем масавай работы, вакол паасобных фактаў звальненьня злосных прагульшчыкаў, кіраўніцтвам правядзеньня гэтых мерапрыемстваў і зачастую лібэральна-апартуністычнымі адносінамі да прагульшчыкаў і ў асаблівасьці да асобных членаў партыі, якія замест барацьбы з прагульшчыкамі, самі зьяўляюцца дэзарганізатарамі вытворчасьці. (Бюро парткалектыву фанэрнага заводу членам партыі Мурашко, Андрэяву, Пільскаму і інш. за прагулы вынесла ім толькі вымову).

1. Пленум адабрае рашэньне бюро ГК і прэзыдыуму ГКК ад 11-І 1933 г. аб барацьбе з прагуламі і патрабуе ад дырэктароў рашучага і неадкладнага пералому ў справе выкараненьня лібэральных адносін да прагульшчыкаў—дэзарганізатараў вытворчасьці і поўнага правядзеньня ў жыцьцё пастановы ЦВК і СНК СССР ад 15|XI—32 г.

2. Кіраўнікам прадпрыемстваў і ўстаноў забясьпечыць такі парадак прыёму на работу, які б гарантыраваў бы ад пралязаньня клясава-варожых элемэнтаў і лятуноў, сыстэматычна ачышчаючыся ад іх, шляхам патрабаваньня ад паступаючага на работу дакумантаў, якія сьведчалі-б яго сацыяльнае становішча і апошнюю мінулую працу.

3. Адзначаючы наліча выпадкаў перанясеньня пры вучоце прагулаў без уважлівых прычын у ўважлівыя, дырэктарам прадпрыемстваў у дэкадны тэрмін устанавіць точную сыстэму ўліку выхада на работу непасрэдна ў цэхах, перагледзець склад табельшчыкаў, забясьпечыўшы яго праверанымі людзьмі. Даручыць бюро ГК і прэзыдыуму КК КП(б)Б праверыць выкананьне гэтага пункта.

4. Адзначаючы вялікую цякучасьць рабсілы, даходзячай да 20 процантаў у м-ц (ф-ка КІМ) і 100 процантаў на працягу году па паасобным цэхам (шчаткомб), пленум прапануе бюро ГК КП(б)Б і 3-кутнікам намеціць шэраг канкрэтных мерапрыемстваў, забясьпечваючых зьвядзеньня гэтай цякучасьці да мінімума, шляхам арганізаванага набора рабсілы, палепшаньня бытавых умоў у інтэрнатах, работы сталовак і г. д.

5. Адабраючы рашэньне бюро ГК аб зьняцьці з работы старэйшага інспэктара працы Бенцман, як не забясьпечыўшай правільнае правядзеньне лініі партыі па барацьбе з прагульшчыкамі і лятунамі, пленум прапануе бюро ГК КП(б)Б узмацніць інспэкцыю працы кіраўнікамі, здольнымі правесьці гэтыя важнейшыя мерапрыемствы.

6. Пленум прапануе ў 5-дзённы тэрмін кіраўнікам прадпрыемстваў і ўстаноў забясьпечыць сыстэму ізьяцьця наборных дакумантаў, пры якой прагульшчык ня мог-бы ніводнага дню карыстацца імі.

7. Пленум адзначае, што з боку раду мэдпунктаў мае месца выдача розных даведак, якія ўводзяць у заблуджэньне мясцовыя арганізацыі, прадпрыемствы, установы, а таксама праяўленьне сымуляцыі ў мэтах нявыхада на работу.

Пленум абавязвае т. Гельфанда (гарздраў) і т. Зьвягіна (страхкаса) на працягу 5-ці дзён склікаць нараду ўрачоў мэдпунктаў, даць ім неабходныя дырэктывы і прыцягнуць да адказнасьці асоб, іх парушаючых.

Трохкутнікам прадпрыемстваў і ўстаноў прымаць меры да сымулянтаў, як да злосных прагульшчыкаў.

8. За апартуністычныя адносіны да правядзеньня барацьбы з прагульшчыкамі, масавае васстанаўленьне прагульшчыкаў, нават пасьля звальненьня заг. цэхоў, незабясьпячэньне ўмоў, папярэджваючых цякучасьць рабсілы, прыём рабочых без папярэдняй дэталёвай праверкі, што дала ў выніку засьмечанасьць кулацка-варожымі элемэнтамі і лятунамі—заг. кадрамі ф-кі «КІМ» т. Літвінавай абвясьціць строгую вымову з папярэджаньнем.

9. За масавае звальненьне рабочых (адным загадам у адзін дзень 16 чал.), не разгарнуўшы вакол гэтага адпаведнай растлумачальна масавай работы, што зьяўляецца іскрыўленьнем правядзеньня ў жыцьцё пастановы ўраду, за лібэральныя адносіны да членаў партыі—прагульшчыкаў, бюро парткалектыву фанэрнага заводу абвясьціць суровую вымову.

Справу аб пам. дырэктара па працы т. Рашаль перадаць на разгляд парткалегіі.

10. За непрыняцьцё мер да зьніжэньня прагулаў у асаблівасьці па аснаўному шчаціннаму цэху, адсутнасьць правядзеньня ўсялякай масавай работы вакол асобных фактаў і неналаджваньня сыстэмы ізьяцьця наборных дакумантаў у звальняемых, бюро парткалектыву шчаткомбу абвясьціць суровую вымову, прыняў да ведама, што старшыня заўкому за факты грубейшых бюракратычных адносін зьняты з работы і выключан з партыі.

Пам. дырэктара па працы т. Гальмштока зьняць з работы.

11. Адзначаючы, што барацьба з прагульшчыкамі і іншымі парушыцелямі працоўнай дысцыпліны праводзіцца выключна адміністрацыйнымі дзеяньнямі, прапанаваць парт. і праф. кіраўніцтву неадкладна наладзіць працу таварыскіх судоў, разгарнуць шырокую растлумачальную працу вакол кожнага паасобнага выпадку звальненьня злосных прагульшчыкаў, рэагуючы ў кожным паасобным выпадку, як на лібэральныя адносіны з боку адміністрацыі, гэтак і на паасобныя выпадкі нячулых бюракратычных адносін да правядзеньня ў жыцьцё пастановы ЦВК і СНК.

12. Улічваючы апартуністычна лібэральныя адносіны паасобных парткалектываў і ячэек да прагульшчыкаў і парушыцеляў працоўнай дысцыпліны «з партбілетамі ў кішэні», у той час, калі член партыі павінен адказваць удвойчы—ня толькі звальняць, але-ж і выключаць з партыі, прапанаваць бюро ГК і прэзыдыуму ГКК разглядзець справу гэтых бюро парткалектываў і ячэек, як няздольных праводзіць лінію партыі на справе.

АБ ПЕРАБУДОВЕ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ І ХОДЗЕ САМАЗАГАТОВАК.

Рэзалюцыя студзеньскага пленуму гаркому КП(б)Б.

1. Пленум гаркому адзначае, што пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і апошняя пастанова партыі і ўраду «аб пашырэньні правоў заводакіраўніцтваў», накіраваныя на стварэньне карэннага пэралому ў справе рабочага снабжэньня, асабліва рабочых прадпрыемстваў, з боку каапэрацыйных арганізацый, гаспадарнікаў, партыйных і прафсаюзных арганізацый праводзіцца ў жыцьцё надзвычайна марудымі тэмпамі, у выніку чаго па асобным зьвеньням каапэрацыйных арганізацый рабочае забесьпячэньне ня толькі не палепшылася, а значна пагоршылася. Гэта зьявілася вынікам адсутнасьці сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за справу рабочага снабжэньня, наяўнасьцю апартуністычнага самацёку і скажэньнем партыйных дырэктыў у гэтым пытаньні (ЗРК «Сьцяг індустрыялізацыі», керамічнікі, лесрабкооп і інш.)

2. Пленум асабліва падкрэсьлівае невыкананьне дырэктыў ураду і партыі большасьцю каапэрацыйных арганізацый у ажыцьцяўленьні дзяржаўнай палітыкі цэн і што ў асобных каапэрацыйных арганізацыях мелі месца скажэньне гэтых дырэктыў, парушэньне канвэнцыйных цэн пры правядзеньні самазагатовак. Аднačасова пленум канстатуе наяўнасьць вялікай колькасьці растрат па каапэрацыйным арганізацыям і на загатоўчых пунктах. На 11 каапэрацыйным арганізацыям у 4-м квартале выяўлена растрат на 52.424 руб. (доррабкооп—6.500, ЗРК „Дзьвіна“—12.378 р., плодатрэст—6.536 р. і г. д.). Справы растрат камуністамі лесрабкоопу Насякойда і Кузьміным на працягу 5-ці месяцаў не разгледжаны і камуністы-растратчыкі працягваюць працаваць у гаспадарчых арганізацыях.

3. Пленум канстатуе, што ні адна каапэрацыйная арганізацыя гораду і сельСТ не выканалі пастаноў бюро гаркому аб разгортваньні дэцэнтралізаваных самазагатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў і па ўнеплянавай закупцы прамтавараў, а ў студзені амаль зусім спынілі самазагатоўкі. Пры н а я ў н а с ь ц і невыкананьня плянаў, зацьверджаных ГК і гарсаветам па самазагатоўкам, большасьцю каапэрацыйных арганізацый дапушчаны рост накладных выдаткаў на лік разбуханьня апарату і разбазарваньня фондаў заработнае платы. ЗРК швэйнікаў перавыдаткаваў фонд зарплаты за 4 ы квартар—74.125 руб., „Дзьвіна“—27.396 руб, панчошніц—29.744 руб., шчаткомбу—15.050 руб, ЦРК—80 090 руб.

Пленум даручае гарКК-РСІ праверыць дзейнасьць пракуратуры па ўсім справам, пераданым ёй у час справаздачна-перавыбарчай кампаніі спажыўкаапэрацыі і прыцягнуць да партыйнай і судовай адказнасьці вінаватых у разбазарваньні фондаў заработнай платы і зрыве плянаў самазагатовак.

Давесьці да ведама ЦК КП(б)Б, што справы перавыдаткаваньня зарплаты марынуюцца ў вярхоўным судзе па 2—3 месяцы.

4. Цэнтральнай задачай усіх каапэрацыйных арганізацый і гаспадарнікаў, і парт'ячэек, і прафсаюзных арганізацый павінна стаць разгортваньне дэцэнтралізаваных загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў і ўнеплянавая закупка іншых тавараў, разам з поўным завяршэньнем выкананьня цэнтралізаваных загатовак усіх відаў.

Пленум абавязвае старшыні каапэрацыйных арганізацый у 2-дэкадны тэрмін заключыць доўгатэрміновыя дагавары з калгасамі, савгасамі і сельСТ на правядзеньне самазагатовак у вызначаных раёнах і падшэфных прадпрыемствам калгасах. Абавязаць сэкратароў парт'ячэек і калектыў устанавіць сталую праверку выкананьня маючыхся дагавароў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу і ўстанавіўшы партыйны і рабочы кантроль над работай кожнага загатавіцельнага пункту.

5. Пленум адзначае, што ў час справаздачна-перавыбарчай кампаніі праведзена часткова самаачыстка кооп-устаноў і загатавіцельных пунктаў ад вароў, растратчыкаў, самаснабжэнцаў (па 11 каапарганізацыям вычышчана 47 чал. за растраты і праведзена скарачэньне гандлюючага апарату на 201 чалавек). Аднак, гэта работа яшчэ не завершана. Пленум абавязвае кіраўнікоў каапэрацыйных арганізацый, ФЗМК і партыйныя ячэйкі на працягу 2-х дэкад праверыць увесь склад загатоўчага і гандлюючага апарату, а таксама асоб, ведаючых выдачай наборных дакумантаў на прадпрыемствах, канчаткова ачысьціць каапэрацыйны апарат ад вароў, растратчыкаў, самаснабжэнцаў і жулікаў, вядучы рашучую барацьбу супроць пранікненьня іх у другія каапэрацыйныя, савецкія і гаспадарчыя арганізацыі.

Пленум даручае бюро гаркому і ГК КСМ да канца студзеня мабілізаваць ня менш 50 партыйцаў і 100 лепшых камсамольцаў, усклаўшы пэрсанальную адказнасьць за якасны падбор мабілізаваных на сэкратароў калектываў і ячэек, адначасова абавязаць аддзел кадраў ГК—т. Голуба і т. Пескіну з саюзам каапэрацыі і дзяржгандлю праверыць матар'ялы аб дызэртырстве з каапэрацыйных арганізацый, мабілізаваных у мінулым годзе партыйцаў і камсамольцаў.

6. Пленум адабрае рашэньне бюро ГК і прэзыдыуму гарКК па пытаньні рабзарваньня хлеба і канстатуе, што гаспадарнікамі і партыйнымі ячэйкамі ня была ўзначалена справа па выдачы наборных дакумантаў на прадпрыемствах, дзякуючы чаму большасьць гаспадарнікаў далі значна правышаныя заяўкі на кантынгенты, дапусьцілі парушэньне інструкцыі ў адносінах пераводу паасобных груп з 3-га ў 2-гі і 1-шы сьпіс, перадаручылі справу выдачы наборных дакумантаў рахункаводам, бухгальтэрам, старшыням ФЗМК, не правялі самаачысткі ад прыхлябацеляй, прагульшчыкаў і лятуноў (акулярная ф-ка, «Сьцяг індустрыялізацыі», біофабрыка, імя Цэткін).

Пленум даручае бюро ГК і прэзыдыуму гарКК РСІ прыцягнуць да партыйнай і крымінальнай адказнасьці асоб, злосна парушыўшых дырэктывы партыі, не змагаючыхся за справу палепшаньня рабочага снабжэньня.

7. Далейшая работа каапэрацыйных арганізацый па пытаньні заработнае платы павінна быць падпарадкавана безагаворачнаму выкананьню пастаноў пленуму ЦК аб канчатковым пераходзе ўсяго гандлюючага апарату на зьдзельшчыну і павінна будавацца ў залежнасьці ад выкананьня імі пляну таваразвароту.

Пленум абавязвае саюз работнікаў каапэрацыі і кіраўнікоў каапэрацыйных і загатоўчых арганізацый закончыць перабудову заработнае платы да 15-га лютага.

(КАНЕЦ НА 4-Й СТАР.)

СЕНЬНЯ РАБСЕЛЬВАЕНКОРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ ЗДАЮЦЬ АСО-АВІАХЭМСКАЙ ШКОЛЕ ЛЕТНІКАЎ САМАЛЕТ № 2595

Мабілізацыяй сіл і сродкаў грамадзкасьці ўзьвядзем у школе—нашым дзецішчы—ангары для самалётаў.

Загад № 34

ПА ВІЦЕБСКАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ШКОЛЕ ЛЁТНІКАЎ імя ВАРАШЫЛАВА.

3 лютага 1933 г. гор. ВІЦЕБСК.

§ 1.

ПАД ПРАВІЛЬНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І ЯЕ ЛЕНІНСКАГА ЦК НА ЧАЛЕ З тав. СТАЛІНЫМ РАБОЧАЯ КЛЯСА І ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ САВЕЦКАГА САЮЗУ ПАСЬПЯХОВА ЗАКОНЧЫЛІ ПЕРШЫ ПЯЦІГАДОВЫ ПЛЯН НЯБАЧАНАГА Ў ГІСТОРЫІ БУДАЎНІЦТВА.

НАША КРАІНА З АГРАРНАЙ, З АДСТАЛАЙ СЯРЭДНЯ-ВЯКОВАЙ ТЭХНІКАЙ ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў КРАІНУ ІНДУСТРЫЯЛЬНУЮ, ВАЛОДАЮЧУЮ ПЕРАДАВОЙ ТЭХНІКАЙ, ПАБУДАВАЎШЫ ЗВЫШ 200 ТЫСЯЧ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ КАЛЕКТЫЎНАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ. НАША КРАІНА З СЛАБАЙ НЕПАДРЫХТАВАНАЙ ДА АБАРОНЫ ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў КРАІНУ МАГУТНУЮ Ў СЭНСЕ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ.

УСТУПІЎШЫ Ў ДРУГУЮ ПЯЦІГОДКУ, ПЕРАД НАМІ ПАСТАЎЛЕНА АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ ЗАДАЧ ПОЎНАГА АЎЛАДАНЬНЯ ВЫСОКАЙ І СКЛАДАНАЙ ТЭХНІКАЙ З ТЫМ, КАБ БЫЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШ ГАТОВЫМІ ДА АБАРОНЫ.

ВІЦЕБСКАЯ ШКОЛА ЛЁТНІКАЎ АСОАВІАХЭМУ—РЭЗЭРВУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ—ДЗІЦЯНЁ БЕЛАРУСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ БАЛЬШАВІКОЎ РУКА АБ РУКУ З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ ВЫКОНВАЕ ЗАДАЧУ, ПАСТАЎЛЕНУЮ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ — ДАЦЬ КРАІНЕ ПАДРЫХТАВАНЫЯ КАДРЫ ЛЁТНІКАЎ.

СЁНЬНЯ ПЕРАДАВАЕМЫ ШКОЛЕ САМАЛЁТ „РАБСЕЛЬКОР УДАРНІК ВІЦЕБШЧЫНЫ", ЯШЧЭ РАЗ ДАКАЗВАЕ, ШТО БУДАЎНІЦТВА КРАІНЫ САВЕТАЎ—ЦЫТАДЭЛІ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ЦЭНТРЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ УВАГІ, У ЦЭНТРЫ ІХ КЛОПАТАЎ.

САМАЛЁТ № 2595 ПАБУДАВАНЫ НА СРОДКІ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ УДАРНІКАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ І ПЯРЭДАНЫ Ў ПАДПАРАДКАВАНУЮ МНЕ ШКОЛУ ГЭТАГА ЛІКУ ЗАЛІЧЫЦЬ У СКЛАД ДЗЕЙНІЧАЮЧЫХ ПЕРШАГА АТРАДУ ШКОЛЫ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ УсеКП(б), ЯЕ ЦК І ПРАВАДЫР ПАРТЫІ Т. СТАЛІН!

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ БУДАЎНІКІ ПАВЕТРАНАГА ФЛЁТУ—РАБСЕЛЬВАЕНКОРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ!

Начальнік школы —
старэйшы лётнік МУРАТАЎ.
Час. камісар школы
ЛАТЫШЭЎСКІ.

ДА ВЕДАМА НАШЫХ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

Кантора газэты „Віц. пралет." просіць усіх рабселькораў, якім прылічваецца ганарар за другое паўгодзьдзе 1932 г., пасьпяшацца атрымаць гэтакі да 20 га лютага.

Пасьля паказанага тэрміну нявыплачаны ганарар будзе пералічан у адпаведныя фонды і выдавацца ня будзе.

Рабселькорам, якія ня маюць магчымасьці зьявіцца ў кантору, ганарар будзе высылацца поштай пры ўмове калі да 20- а лютага будзе атрымана заява аб высылцы грошай з паказаньнем адрасу.

КАНТОРА ГАЗЭТЫ.

Ня менш, чым на „добра".

ЛЕВІНТАЎ.

Каля 15 кілёмэтраў ад гораду, ў былым панскім фольварку знаходзіцца віцебская школа лётнікаў імя т. Варашылава.

Два гады назад на гэтым месцы былі толькі адзін напалову зруйнаваны панскі дом (а дом то невялічкі), ліпавая алея і некалькі старых хатак—былы прытулак панскіх батракоў.

Няма зараз алеі і няма таксама і старых хатак, адрамантаваны зараз панскі дом, у якім зьмяшчаецца школьная сталоўка.

У тав Муратава—начальніка школы малы і скромны габінэт. Прыемна сядзець у гэтым габінэце, глядзець у вакно на панараму школы і слухаць аб мінулым, слухаць успаміны таго, хто два гады з лішнім таму назад 1 га сьнежня 1930 году выдаў загад № 1, што «з гэтага ліку прыступаю да выкананьня абавязкаў начальніка віцебскай школы лётнікаў, згодна пастановы Цэнтральнага савету Асоавіахэму СССР". З гэтага часу бязьзьменна, ня ведаючы адпачынку і не шкадуючы сіл, т. Муратаў на чале будаўніцтва і кіраўніцтва школай.

Былы сталяр, потым лётнік, правёўшы ўсю грамадзянскую вайну на франтох, пры дапамозе групы таварышоў з вішто ўзводзілі школу.

Заштаф—тстаршыня віцебскага савету Асоавіахэму, актыўны арганізатар школы, актыўны змагар за яе ўмацаваньне.

Данцоў—авіятэхнік, адзін з старэйшых работнікаў школы.

Латышэўскі—загадчык гаспадарчай часткай.

Федасеенка—лётны інструктар, выхаваны школы. Былы матарыст, за кароткі час авалодаў лётнай справай і даў многа лётнай школе ў справе падрыхтоўкі лётных кадраў для нашай краіны.

Вось яны—гэрої «дробязяй», гэрої абароны. Штодзённай і ўпартай работай яны замацавалі школу.

Цяжкі былі першыя крокі школы...

15 сакавіка 1931 году школа прыступіла да тэарэтычных занятказў, аднначасова (на гэтым месцы, дзе зараз знаходзіцца школа) пачалі будаваць аэрадром.

1-га чэрвеня 1931 году школа прыступіла да практычных лётных занятказў.

У гэтым доме, дзе зараз знаходзіцца сталоўка, была казарма вучлётаў, кватэры начальніцкага тэхнічнага складу, майстэрні і канцылярыя. У адным невялічкім доме—ўся школа. У маленькім пакоіку—габінэце начальніка—займаліся.

З таго часу школа пачала умацоўвацца, павялічылася яе матар'яльная часта, пачалі будавацца жылыя памяшканьні і памяшканьні для спэцыяльных - патрэб і, галоўнае, школа набывае аўтарытэт сярод працоўных Віцебшчыны.

З гэтага часу пачалося сталае камплектаваньне каманднага і тэхнічнага складу. Ня зьбеглі цякучасьці, але тыя, хто засталіся—работаюць добрасумленна, як кажуць не за страх, а са сумленьне.

Школа праводзіць вялікую грамадзкую работу сярод ваколічнага насельніцтва. У час хлебазагатовак вучлёты дапамагалі сельсавету выконваць плян. У школе на вышыні палітычна-масавая і грамадзкая выхаваўчая работа, выпускаецца насьценгазэта „Па старт".

Зараз школа ўключылася ў варашылаўскую эстафэту, якую вядзе пад лёзунгам „Школа, якая носіць імя тав. Варашылава, павінна атрымаць пяршынства у эстафэце". Выпрацавана рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі пасьпяховае правядзеньне эстафэты. Школа разгортвае работу па арганізацыі ў Віцебску аэраклюбу. Ужо вучацца без адрыву ад вытворчасьці 25 чалавек.

Школа мае харчовую базу—даволі моцную сельскую гаспадарку і скотную фэрму. Яна сябе на зіму забясьпечыла гароднінай.

* * *

Ужо і з гэтага, вельмі маленькага апісаньня, бачна, як за гэты кароткі час школа вырасла, школа цьвёрда стала на ногі. У яе актыве —тры выпускі пілётаў. Кантрольныя лічбы, дадзеныя Цэнтральным Саветам Асоавіахэму, перавыкананы.

Зараз у цэнтры школьнага жыцьця стаіць пытаньне павышэньня якасьці вучобы, уся ўвага накіравана каб на «добра» і «выдатна» закончыць тэорыю і ня горш правесьці лётную практыку, каб як магчыма найлепш аўладаць тэхнікай лётнай справы.

Ніводнай аварыі—вось што прыкоўвае ўсю ўвагу грамадзкасьці школы лётнікаў.

Школа лётнікаў—дзецішча пралетарскага Віцебску. Школа яшчэ адчувае патрэбу ў штодзённай дапамозе. Трэба дапамагчы пабудаваць ангары, жылыя памяшканьні, клюб і г. д.

Справа гонару грамадзкасьці Віцебшчыны ў гэтым школе дапамагчы.



№ 2595.

САМАЛЁТ ВУЧЭБНАГА ТЫПУ

Аўладае добрымі лётнымі якасьцямі.

Зручны ў абслугоўваньні.

Нескладнай канструкцыі.

Бярэ на борт інструктара і вучня.

Мае лёгкае двайное кіраваньне, чым ажыцьцяўляецца паказ вучню кіраваньня самалётам і выпраўленьне яго памылак у паветры.

Самалёт абсталяван усімі неабходнымі прыладамі, якія кантралююць работу матору і самалёту.

САМАЛЁТ І МАТОР ПАБУДАВАНЫ НА НАШЫХ САВЕЦКІХ ЗАВОДАХ І З НАШЫХ МАТАР'ЯЛАЎ.

Мае дастатковую хуткасьць, якая дае вучню магчымасьць асвоіцца з паветрам.

Самалёт выконвае ўсе фігуры вышэйшага пілётажу, як-та петлі, пераваροты, штопар і г. д, што дае магчымасьць павышаць кваліфікацыю выпускаемага пілёта.

Матор эканомны ў выдаткаваньні гаручых змазачных матар'ялаў.

Самалёт і матор аўладаюць дастатковай трываласьцю.

НЕ „ПРЫКМЕЦІЛІ" КУЛАКА.

Пры давядзеньні пляну мясазагатовак да аднаасобнага двара Рудніцкі сельсавет якім та чынам «выпусьціў з поля зроку» кулацкую гаспадарку ПАЛІЦКАГА ЛЯКСЕЯ, які мае карову, некалькі сьвіней і інш. жывёлу Таксама ніякімі абавязацельствамі па здачы сельгаспрадукцыі дзяржаве не абавязаны кулак ВАСІЛЕЎСКІ з вёскі Гаравічы, які вычышчаны з калгасу.

Сельсавет і партыйная ячэйка павінны зараз-жа зьмяніць свае адносіны да кулацкіх гаспадарак. Неадкладна гэтым гаспадаркам уручыць абавязацельствы па здачы прадукцыі дзяржаве,

Я.

ПАРТКАЛЕГІЯ гарКК КП(б)Б ПРАПАНУЕ

ніжэйпаказаным членам і кандыдатам партыі зьявіцца на пседжаньне парттройкі 4 га лютага, а 6 гадз. увечары ў гарком партыі (пакой № 6): Казлоў Нікіта Пракопавіч—яч. інстр. мэбл. чл. п 1620602; Сьмятанін Васіль Васільяў—1 пажаркаманда ст. Віцебск к|к. № 67642; Капусьцін Кірыл Пятровіч—яч. голкавай фабрыкі, к|к № 69043; Валчок Мікола Платонавіч—яч сувязі, чл. б. № 2040105; Гуткін Давід Шлем—п|к. Будаб'ядаваньня, к|к. № 34898; Іванова Хрысьціньня Якаўлеўна—яч. кааnг. „Новы сьвет", к|к. № 64586; Пярлоў Хона Веніямінаў—гарадоцк райпартарганіз.; Міронаў Захар Андрэевіч—п|к. трамваю, к|к. 64520; Тароткін Ян Максімаў—п|к. трамваю, п|б. № 240 623; Ярошкін Сяргей Кузьміч—п|к. трамваю, к|к. 2100; Антонцаў Хвёдар Андрэяў—пабуд ва Дзьвінскага мосту, к|к. № 266; Прохор ў Іван Міхайлаў—пабудова Дзьвінск. мосту, к|к. № 60855; Багін Уладзімір Якаўл.—яч. Забалоцінка, п|б. 316129; Старавойтаў Пётра Сямёнаў—п|к. міліцыі, п|б. 1543496; Авегава Надзея Аляксандр—п|к. фабр. „КІМ", к|к. 64796; Камарова Вера Ільінічна—п|к. фабр. „КІМ, к|к. 644 0; Ксяндзова Цыпа Абрамаўна—п|к. „КІМ" к|к. 64663; Рыжык Зэлік Янкаў—яч. „Каапрамонт", к|к. № 43266; Булыгін Рыгор Пракопаў—яч. ложкавай, к|к 64707; Антаневіч Павал Іванавіч—яч. віц. тэкст. тэхн.; Пучкоў Васіль Дзямідаў—яч. віц. тэкст. тэхн, к|б. 0804529; Лу-Ін-цын—яч. камтрэст, п|б. 1301808; Касіраў Васіль Ціман—яч. біо-фабрыкі, п. б. 0297617; Шчура Уладзімер Пятроў—яч. Саюзтранс, к|к. 49793; Кузьнечыў Кузьма Хвёдараў—яч. Саюзтранс, к|к. 64595; Відасава Якац. Яхіхава—яч. с|г. Цераполь, к|к. 39 76; Проза Тацьяна Сьцяпанаўна яч. вэтінстытут, п|б. 1620615, Таўпінец Ягор Ільліч—яч. параходу „Вяліса", п|б. 2403703; Літвінаў Хвёдар Дзьмітрыеў, яч. Білева-Янопаль; Любкоў Міхась Сямёнав, п|к. акулярнай фабр, п/б. 1625527; Кісьлін Шолам Лейбаў—п|к. Лекерта, п|б. 2401572; Навыцоцкі Георг. Аляксандр. — яч. кант. сувязі, п|б. 1475253; Чарняўскі Браніслаў Восіп. яч. ВОПШ п|б. 16 6 3; Бураў Яфім Ільліч п|к. Клары Цэткін, к|к. 64721; Уласаў Пётра Ляксеяў—яч. скураян фабр, к|к 17571; Ханін Наум Аўсеяў п|к. акулярная фабр, к|к. 64564; Шаромкаў Іван Якімаў п|к. скурзаводу; Курбанаў Рыгор—п|к. мах. маш. буд. тэхн; Ланец Мікола Фаміч—яч. Саюзтранс, п|б 2725809; Наротаў Пётра Філімонавіч — яч. дрожджзаводу, к|к. 68042; Сямёнаў Захар Якубавіч—яч. абозу ЦРК, кк 64845; Вярыга Станіслаў — п|к. руху МББ чыг; Лейшыцкі Іван Філіпаў — п|к. трамваю, к|к. 7 902; Бэшканаў Трафім Абрам. — ячэйка лямецк. фабр. к|к. 49753; Кліменка Вера Мікал. яч. лямецк. фабр, к|к 49542; Кургузава Т. Т — п|к. фабр. КІМ, к|к. 77271; Масташоў Захар Цімахвеяў—п|к. руху МББ чыг., к|к. 67864; Валынскі Уладзімер Генр—п|к руху МББ чыг., п|б. 64 5397; Цыганок Рыгор Дарафеяў — п|к. руху МББ чыг, к|к. 64649; Мядзьведзеў Міхась Харытонаў—п|к руху МББ чыг. к|к 64654; Козінаў Сяргей Кірыл. п|к. руху МББ чыг. к|к 64647; Голубеў Калістр. Кастус.—п|к. руху МББ чыг., к|к. 64650; Англічанаў Цімахв. Фёдар — п|к. руху МББ чыг., к|. 7210; Чарвякоў Алесь Якубаў—п|к. руху МББ чыг., к|к. 65051; Саўчэнка Тацьяна Анар.—п|к. руху МББ чыг к|к. 49874; Паташкін Самуіл Хаймав.—яч. 4-га вуч. войск-будаўніцтва.

Парткалегія гарКК КП(б)Б.

Папраўка.

У нумары 24 „Віцебскага пралетара", у зводцы запазычанасьці па загатоўках сена і саломы ўкралася памылка: у графе запазычанасьці саломы па аднаасобнаму сэктару Міхалеўскага сельсавету ня лічылася нічога, у той час, як запазычанасьць гэтая складае 27 цэнтнэраў

4-га лютага, а 7 гадз. увечары, усебеларуская радыё пераклічка аб дню назыкатрымапеля. Прапануецца сакратарам партколектываў і ячэек забясьпечыць масавае слуханьне ў клюбах, чырвоных кутках.

ГК КП(б)Б

8 ЛЮТАГА ВЯРХОЎНЫ СУД БУДЗЕ РАЗЬБІРАЦЬ СПРАВУ ШКОДНІКАЎ З КАЛГАСУ „ПАРЫСКАЯ КАМУНА".

МАЦНЕЙ РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ. АХОЎВАЙЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ЎЛАСНАСЬЦЬ.

„Уне чаргі на лаву падсудных"—пад такім загалоўкам 5-га студзеня 1933 году „Віцебскі пралетары" зьмясьціў матар'ял аб шкодніцтве ў калгасе „Парыская камуна". Пракуратура вытварыла сьледзтва і 8-га лютага шкоднікі калгаснага будаўніцтва ў колькасьці 13 чал. прадстануць перад пралетарскім судом. 8-га лютага ў Шумнянскім сельсавеце выязная сэсія Вярхоўнага суду Беларусі будзе разглядаць справу шкодніцтва ў калгасе „Парыская камуна", у рэзультаце якой калгас і калгасьнікі страпілі да 96 цнтн. бульбы, у ім страчана працаздольнасьць конскага парку, раскрадзена жыта калгасу з поля, у час малацьбы і пасьля малацьбы.

Вярхоўны суд БССР будзе разглядаць справу шкодніцтва і пакасьніцтва людзей, якія ўкрыліся ў калгасе ад цьвёрдых заданьняў, былых жандара і афіцэра, людзей, пралезшых у калгас для таго, каб яго разлажыць знутры і для выкананьня сваёй мэты захапіўшых у калгасе такія пасады, як брыгадзіраў, кладаўшчыкоў і старшыні рэвкамісіі. Для кулацкай зграі аказаўся вельмі карысным былы цьвёрдазаданьнік Бульбянкоў Мікола, які, зьяўляючыся старшынёй рэвкамісіі, прыкрываў сваё шкодніцтва і шкодніцтва астатніх падсудных. Ён былы афіцэр—загадчык кузьні Чуйкін Нічыпар і былы жандар Сарокін Ягор ня толькі эканамічна падрывалі магутнасьць калектыўнай гаспадаркі, але-ж і вялі палітычную агітацыю супроць калгасу, супроць улады.

У пракуратуру і „Віцебскі пралетары" пачалі ўжо паступаць водгукі працоўных з прадпрыемстваў і калгасаў, у якіх патрабуецца жорсткае пакараньне арганізатараў эканамічнай контррэвалюцыі. Сваё моцнае слова супроць падрыўшчыкаў новага калгаснага ладу павінны і скажуць усе рабочыя, усе калгасьнікі Віцебшчыны.

ВІЦЕБСКІ ДЗЕНЬ.

● У ПЕРШЫМ ГОДЗЕ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ на палепшаньне добрабыту гораду адпушчана 415.000 рублёў. Сюды ўваходзіць: брукоўка вуліц 300 000 руб., азяляненьне гораду —20.000 руб, пабудова купальняў—6.000 руб., асьвятленьне—45.000 руб., ачыстка гораду—30.000 руб, аварыйная работа, пабудова асфальтавых тратуараў і інш. работы 14 000 руб.

● У 1933 ГОДЗЕ 500.000 РУБЛЁЎ будзе выдаткавана на капітальнае ўкладаньне ў пашырэньне трамвайнага руху.

● ДЛЯ СКАНЧЭНЬНЯ ПАБУДОЎ МАГІСТРАЛІ ў Пралетарскай слабадзе і рэканструяваньне вадакачкі адпушчана 500 000 руб.

● НА ЗАВЯРШЭНЬНЕ ПАБУДОВЫ ЛАЗЬНІ ПРАЛЬНІ адпушчана ў 1933 годзе 300.000 р.

● НА БУДАЎНІЦТВА АСЕНАБОЗУ адпушчана 75.000 рублёў

● ДЛЯ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ГУЖТРАНСПАРТУ, набыцьце коняй і інш адпушчана 30.000 руб.

● ДЛЯ ПАШЫРЭНЬНЯ АЎТАТРАНСПАРТУ адпушчана 5.000 рублёў.

● У 1933 ГОДЗЕ БУДЗЕ ПАБУДАВАНА ПАЖАРНАЕ ДЭПО ў Пралетарскай слабадзе, для гэтага адпушчана 70 000 рублёў

● НА КАМУНАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА адпушчана 1.050.000 рублёў, сюды ўваходзіць сканчэньне пабудовы 3, 4, 5, 6 камунальных дамоў і сканчэньне пабудовы дому для спэцыялістаў.

● ЗА ПЕРШУЮ ПЯЦІГОДКУ ВІЦЕБСКІ ТРАМВАЙ даў 1 831.541 руб. прыбытку замест 218.361 рублёў у 1927—28 г. г. Лік вагонаў на 1-е студзеня 1933 году складаў 18 (замест 9). Даўжыня шляху ў 1928 г. складала 10,7 кілёмэтраў, а ў 1932 г.—19 кілёмэтраў.

● НА СКАНЧЭНЬНЕ БУДАЎНІЦТВА ШЧАТКОМБУ адпушчана на 1933 год 285.000 рублёў. Сюды ўваходзіць: 97.000 руб. на мэханізацыю вытворчасьці, 133 000 руб. на поўнае сканчэньне камбінату і 40.000 руб. на жылбудаўніцтва.

Канец рэзалюцый студзеньскага пленуму гаркому КП(б)Б

Аб перабудове спажывецкай каапэрацыі і ходзе самазагатовак.

8. Канстатуючы невыкананьне неаднаразовых пастаноў бюро ГК аб палепшаньні пераважнага забясьпечаньня ўдарнікаў і падпарадкаваньня ўсёй сыстэмы работы спажыўкаапэрацыі барацьбе за прамфінплян, пленум катэгарычна абавязвае кіраўнікоў каапэрацыйных арганізацый, гаспадарнікаў і ФЗМК устанавіць сыстэматычны кантроль над выдаткаваньнем усіх фондаў рабочага снабжэньня і прадуктаў, атрымліваемых праз загатоўчыя пункты, забясьпечыўшы выкананьне пастаноў партыі аб пераважным забясьпечаньні ўдарнікаў.

9. Пленум канстатуе невыкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб палепшаньні матар'яльна-бытавога становішча работнікаў прылаўка і абавязвае фракцыю ГСПС, разам з саюзам работнікаў каапэрацыі і партыйнымі ячэйкамі зрабіць на працягу месяца выбарачную праверку работы паасобных крам ЗРК і загатоўчых пунктаў, забясьпечыўшы выкананьне дырэктыў ГК аб стымуляваньні работнікаў прылаўка і лепшых загатавіцелей.

10. Дырэктыва партыі і ўраду ў галіне аказаньня фінансавай дапамогі ЗРК па раду каапарганізацый гаспадарнікамі ня выканана, дзякуючы чаму па ЗРК мэталістаў, «Сьцяг індустрыялізацыі», керамічнай і інш. каапарганізацыях знаходзяцца ў вельмі напружаным фінансавым становішчы, што адбіваецца на выкананьні пляну самазагатовак.

Пленум даручае бюро гаркому паставіць пытаньне аб фінансаваньні каапарганізацый перад ЦК КП(б)Б і адначасова абавязвае гаспадарнікаў устанавіць сапраўдны кантроль над скарыстаньнем сродкаў па самазагатоўкам па прамому прызначэньню.

11. Пленум адзначае, што работа сталовак яшчэ не зьяўляецца арганічнай часткай усёй работы ЗРК і гаспадарчых арганізацый, у рэзультаце чаго, па большасьці сталовых гораду наяўнасьць значнага пагоршаньня грамадзкага харчаваньня (абмежаваная колькасьць мясных абедаў, высокія цэны, бруднасьць, неарганізаванасьць у час выдачы абедаў рабочым) і катэгарычна абавязвае дырэктароў прадпрыемстваў і іх намесьнікаў па рабочаму снабжэньню—старшынь ЗРК неадкладна дабіцца сапраўднага рашучага карэннага пералому ў паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, каб справа грамадзкага харчаваньня сапраўды зьяўлялася цэнтральнай часткай работы ўсяго рабочага забесьпячэньня.

Пленум абавязвае дырэктароў прадпрыемстваў, загадчыкаў сталовых, партколектывы і фракцыі ФЗМК неадкладна забясьпечыць паляпшэньне якасьці абедаў, зьніжэньне іх кошту, рашучы паварот у справе паляпшэньня санітарных умоў сталовых (пабелка, цыраты, штодзённае мыцьцё падлог і г. д.), наладзіўшы штодзённы рабочы кантроль над работай сталовых.

12. Пленум гаркому паказвае сакратарам партколектываў і сакратарам каапэрацыйных ячэек ЗРК на недапушчальнае слабае разгортваньне партмасавай работы ў каапэрацыі і прапануе партколектывам узмацніць кіраўніцтва работай ячэек ЗРК, пераносячы партработу, галоўным чынам, у крамы, сталовыя, наблізіўшы ўсю партработу ў каапэрацыі да ўсёй агульнай партмасавай работы вытворчасьці.

АБ ВЫСТУПЛЕНЬНЯХ т.т. КАХАНОЎСКАГА І АДЭГАВА.

Пастанова пленуму Віцебскага гаркому КП(б)Б ад 25 студзеня 1933 г.

Заслухаўшы выступленьні т.т. Каханоўскага і Адэгава, пленум ГК канстатуе, што т. т. Каханоўскі і Адэгаў, зьяўляючыся выкладчыкамі грамадазнаўчых дысцыплін, дапусьцілі ў сваім выкладаньні цэлы рад груба-палітычных памылак, выказаўшыхся ў тым:

1. Што т. Каханоўскі:

а) кваліфікуе тэорыю трацкізму аб законамернасьцях пераходнага пэрыяду не як контррэвалюцыйную, а як «несастаяцельную»;

б) замест разгрому рэшткаў кулацтва ён ставіць пытаньне «аб нажыме на кулацтва»;

в) што ён абвінавачвае ў гнілым лібэралізьме ў хлебазагатоўках усю беларускую партыйную арганізацыю.

2. Што т. Адэгаў дае сваім студэнтам карыстацца літаратурай, у якой маецца рад праваапартуністычных скажэньняў (тэорыі раўнавагі).

3. Пленум прымае да ведама заяву т Каханоўскага аб прызнаньні ім і асуджэньні дапушчаных памылак у паданай у гарком КП(б)Б заяве. Пленум, аднак, знаходзіць, што т Каханоўскі ня даў бальшавіцка разгорнутую крытыку гэтых грубых палітычных памылак у сваіх двухразовых выступленьнях на пленуме гаркому КП(б)Б.

4. Пленум ГК патрабуе ад т. Каханоўскага ў сваёй штодзённай рабоце, асабліва ў выкладаньні, даць разгорнутую крытыку сваіх памылак і прапануе яму забясьпечыць сваім выкладаньнем мэтадалёгію марксызму-ленінізму.

5 Пленум даручае бюро (у сувязі з адмаўленьнем т. Адэгавым ад дапушчаных ім памылак) абсьледваць выкладаньне ў мэханічным тэхнікуме.

6. Пленум зварочвае ўвагу ўсяго калектыву выкладчыкаў-партыйцаў на неабходнасьць большай партыйнай ваяўнічасьці і завостранасьці ў сваім выкладаньні і ў сваёй штодзённай рабоце кіравацца дырэктывамі т. Сталіна ў яго гістарычным лісьце «аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму».

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Галоўліт № 12. Друкарня „...тэрэ", ... № 10. Тыраж 8.500 экз.